Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 13 (28123) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Хто галоўны на здымачнай пляцоўцы?

СТАР. 9



## Шчасце — паняцце шматграннае

СТАР. 10



## Пра што маўчаць мужчыны

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**531**

*жыхар Беларусі пераадолеў стагадовы рубеж, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Традыцыйна сярод айчынных доўгажыхароў лідзіруюць жанчыны: сваё 100-годдзе перасягнулі 464 жанчыны і 67 мужчын (прадстаўнікоў моцнага полу сярод тых, хто адсвяткаваў свой соты дзень нараджэння, у 7 разоў менш). На 1 студзеня ў краіне налічвалася пяць беларусаў ва ўзросце 110 гадоў і старэйшых, з іх два чалавекі — жыхары Гродзенскай і Мінскай абласцей — ва ўзросце 115 гадоў і старэйшых, яны нарадзіліся на пачатку мінулага стагоддзя. Сярод рэгіёнаў краіны лідарам па колькасці доўгажыхароў з'яўляецца Гродзенская вобласць: тут на 1 студзеня было 106 чалавек, старэйшых за 100 гадоў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21095,00 | ▼ |
| Еўра | 22809,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 262,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 854,05 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X



ПРАКАВЕТНАЕ

# БЫВАЙ, КАЛЯДА!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Мясцовым абрадам «Цягнуць Каляду на дуба» ў Беларусі завяршылася своеасаблівае закрыццё «каляднага сезона». У вёсцы Новіны Бярэзінскага раёна пры ўдзеле многіх прадстаўнікоў раённых метадычных цэнтраў Міншчыны адбылося традыцыйнае дзеянне з маляўнічымі архаічнымі элементамі, якія ў наш час набываюць усё большую каштоўнасць.**

СТАР. 5

■ Свая справа

## Я Ў РАМЕСНІКІ ПАЙШОЎ БЫ...

### Як атрымаць 17 мільёнаў для пачатку ўласнага бізнесу?

**Антось летась скончыў Акадэмію мастацтваў і цяпер працуе па размеркаванні ў Радашковічах. Калі завітваю ў госці да яго бацькоў, дзіву даюся: іх кватэра нагадвае галерэю — паўсюль вырабы з гліны, парцаляны. «Табе трэба адкрываць сваю справу», — кажу яму. Хлопец толькі паціскае плячыма. «Час ад часу наведваюць такія думкі, але не ведаю з чаго пачаць, дзе ўзяць грошы на ганчарны круг, печ для абпалу?..»**

**Так склалася, што сярод знаёмых у мяне нямала рамеснікаў. Многія з іх, ведаю не па чутках, таксама былі ў падобнай сітуацыі: сумненні, няўпэўненасць у сваіх сілах, недахоп грошай. Менавіта ад аднаго з іх я даведалася пра цудоўную магчымасць — бязвыплатную дзяржаўную субсідыю для пачатку бізнесу.**

*РАМЕСНІК Уладзімір Дрындрожык вырабляе музычныя інструменты: флейты з бамбуку, акарыны з какосу, посахі дажджу з баршчэўніку, металічныя глюкафоны... Па адукацыі хлопец — дызайнер, але, прызнаўся, праца ў офісе яму не па душы. «Куды прыемней працаваць рукамі, з натуральнымі прыроднымі матэрыяламі, чым сядзець гадзінамі перад маніторам камп'ютара, які забірае ўсю энергію.*

СТАР. 5



Фота Надзеі БУЖАН.

**Раменік Уладзімір ДРЫНДРОЖЫК (справа) не толькі вырабляе флейты, але і грае на іх.**

■ Сітуацыя

## МЕТРЫ, ВЫ ЧЫЕ?

### Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, ці маглі быць інтэрнаты кватэрамі

**У Магілёве будтрэст №12 працягвае высяляць жыхароў пасляваенных дамоў праз суд. Летась у падобнай сітуацыі апынуліся жыхары дома №59 па вуліцы Ленінскай. Цяпер лісты на высяленне атрымліваюць жыхары двухпавярховіка па вуліцы Заслонава, 29. У найбліжэйшы час ім давядзецца з'ехаць з нажытых месцаў: каму ў інтэрнат, а каму, вобразна кажучы, проста на вуліцу... Балансатрымальнік дома ААТ «Будтрэст №12» больш не жадае мірыцца з тым, што на яго камунальных метрах жывуць людзі, якія не маюць дачынення да прадпрыемства. Для яго гэта — інтэрнат, і кропка. А вось жыхары дома лічаць, што жывуць у кватэрах. З імі салідарны жыхары яшчэ чатырох будтрэстаўскіх дамоў — №28 і №30 па вуліцы Заслонава, а таксама №4 і №6 па вуліцы Будаўнікоў. Ім таксама «свеціць» высяленне.**



**Нашчадкі тых, хто ў 60-80-я гады атрымліваў неперспектыўнае жыллё, апынуліся перад фактам, што ісці ім няма куды...**

### «ЧАРОЎНАЕ» ПЕРАЎТВАРЭННЕ

Усе гэтыя двухпавярховікі пасляваеннай забудовы першапачаткова мелі аднолькавую, знаёмую многім планіроўку — доўгі калідор, па абодва бакі якога пакоі і агульныя кухні (прыбіральня на вуліцы). Цяпер гэта кватэры з санвузламі і ўласнымі кухнямі. Жыхары кажуць, што самастойна рабілі рэканструкцыю, але з вуснага дазволу адказных асоб трэста: прадпрыемства мела цяжкасці з фінансаваннем. Яны ўпэўнены, што мелі падставы лічыць сваё жыллё кватэрамі, і сцвярджаюць, што інтэрнатамі дамы сталі для іх зусім нечакана.

— У 2002 годзе сабралі ўсіх разам і далі падпісаць пустыя лісты. Папрасілі, каб мы ўпісалі, што будзем своечасова аплачваць камунальныя паслугі за наяўны разлік, — кажа жыхар дома №29 па вуліцы Заслонава Сяргей Куродаў. — Ніхто нічога нам не казаў, не пытаўся, ці згодны мы на пагаршэнне сваіх жыллёвых умоў. Нам схлусілі: сказалі, што цяпер ордары не дзейнічаюць, замест іх — дагаворы. А калі вярталі лісты, там ужо быў пазначаны новы статус нашых дамоў — інтэрнат. Цяпер высяляюць, нягледзячы на тое, што ў дагаворы з Будтрэстам тэрмін яго дзеяння абазначаны як пастаянны.

СТАР. 7

# Стабільнасць і бяспека — галоўная ўмова ўстойлівага развіцця дзяржавы

**Аляксандр Лукашэнка пацвярджае міралюбівую палітыку Беларусі, але разам з тым заяўляе аб рашучасці ў адстойванні нацыянальных інтарэсаў**

**Учора пад старшынствам Прэзідэнта прайшло пасяджэнне Савета бяспекі па пытанні разгляду Ваеннай дактрыны Беларусі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы можам публічна пацвердзіць нашу міралюбівую палітыку і адсутнасць варожасці да іншых дзяржаў. Разам з тым заявіць аб рашучасці ў адстойванні сваіх нацыянальных інтарэсаў. У тым ліку, калі спатрэбіцца, з прымяненнем усёй ваеннай арганізацыі дзяржавы, — сказаў беларускі лідар. — Гэта значыць нам нічога чужога не трэба, але метра свайго не аддадзім. Гэта не намі прыдумана». Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што прамая ваенная пагроза Беларусі адсутнічае. «На першы план выйшлі выклікі іншага характару. Аднак, як гаворыць народная мудрасць, «порах трэба трымаць сухім». І гэта мудрасць захоўвае сваю актуальнасць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што новая Ваенная дактрына вызначае погляды беларускай дзяржавы на забеспячэнне ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны. Ён нагадаў, што з моманту зацвярджэння дзеючай дактрыны прайшло паўтара дзясятка гадоў і за гэты перыяд абстаноўка ў свеце і вакол Беларусі кардынальна змянілася. У прыватнасці, абвастрыліся супярэчнасці сусветных і рэгіянальных цэнтраў сілы ў барацьбе за перадзел сфер уплыву і імкненне адстойваць свае геапалітычныя інтарэсы рознымі спосабамі. «Актыўнае выкарыстанне механізмаў «каляровых рэвалюцый» для звяржэння законнай улады прывяло да павелічэння колькасці ўзброеных канфліктаў. Пры гэтым усё часцей дасягненне палітычных мэт адбываецца шляхам падрыву дзяржавы знутры», — адзначыў беларускі лідар.

«У стан хаосу ўведзены Ірак, Лівія, Емен, працягваецца кровапраліцце ў Сірыі. Шэраг «гарачых кропак» знаходзіцца ў «замарожаным» стане і можа ўспыхнуць у любы момант», — канстатаваў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што тэрарызм захліснуў увесь свет, ад еўрапейскага кантынента да Злучаных Штатаў Амерыкі, а паток бежанцаў, якія бягуць ад вайны, актыўна накіроўваецца ў Еўропу. «Узмацніліся супярэчнасці паміж Расійскай Федэрацыяй і дзяржавамі — членамі НАТА, калі не сказаць больш. І паміж імі апынуліся мы, як паміж молатам і кавадлам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што захоўваецца пагроза глабальнай і рэгіянальнай бяспецы, пры гэтым далейшая эскалацыя абстаноўкі можа мець непапраўныя наступствы як для Еўропы, так і ўсяго чалавецтва. Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што ўзніклі новыя з'явы, якія патрабуюць адэкватнага рэагавання. Так, на змену традыцыйным формам вайны прыйшлі іншыя, у тым ліку так званыя гібрыдныя. У іх значна павысілася роля інфармацыйных рычагоў уплыву на фарміраванне грамадскай думкі ў той або іншай дзяржаве.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што аналіз сучаснай абстаноўкі вымушае скарэкціраваць падыходы да комплекснага забеспячэння нацыянальнай бяспекі, у тым ліку ў ваеннай сферы. Ён адзначыў, што ў мінулым годзе была пастаўлена задача міністру абароны выбудаваць усе варыянты сілавога рэагавання на сучасныя пагрозы з улікам доўгатэрміновага прагнозу, адлюстраваўшы гэта ў новай рэдакцыі Ваеннай дактрыны, што і было выканана.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адобрыў новую Ваенную дактрыну Беларусі па выніках праведзенага пасяджэння Савета бяспекі. Ён даручыў пры неабходнасці ўнесці ў дакумент праўкі з улікам праведзенага абмеркавання. У бліжэйшы час праект закона, што прадугледжвае зацвярджэнне Ваеннай дактрыны, будзе ўнесены Прэзідэнтам на разгляд у парламент.

«Забеспячэнне стабільнасці і бяспекі — гэта галоўная ўмова ўстойлівага развіцця дзяржавы і наша важнейшая задача», — упэўнены Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што беларускі народ не даруе ўладзе, калі не будзе забяспечана бяспечнае жыццё ў краіне і суверэнітэт.

«У любога народа, тым больш нашага, беларускага, да ўлады заўсёды былі і ёсць прэтэнзіі: і цэны высокія, і мяса, малака мала або шмат, і шмоткі не такія, як імпартныя, і зарплаты, і пенсіі невысокія, агароджы зламаліся, дахі прадзіравіліся, снег не прыбрала ўлада з вуліц, машыны не ачысціла своечасова і г.д. І з цягам часу гэтыя прэтэнзіі адыдуць, яны проста забудуцца, або народ, як гэта заўсёды бывае, уладзе даруе. Але не даруе аднаго — калі мы яму не забяспечым бяспеку і абарону суверэнітэту і незалежнасці краіны. Вось тады ні шмоткі, ні мяса, ні малако — нічога не трэба будзе, калі не будзе кавалка зямлі, на якім будуць жыць нашы дзеці і ўнукі, — сказаў Прэзідэнт. — Таму, калі застанецца апошні рубель у бюджэце або кішэні дзяржаўнай, то патрацінь яго трэба на бяспеку нашага народа, на бяспечнае жыццё народа. Гэта галоўнае».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка прыгадаў Украіну. «Спытайце сёння ў любога ўкраінца, які жыве там, не толькі ў Данецку, Данбасе, Луганску — што для іх галоўнае? У іх жа і жыцця фактычна няма, з пункту гледжання нашага народа. Там ніхто ўжо не гаворыць пра цэны, пра мяса, пра валюту, пра курс і г.д. Там усе мараць аб тым, каб ад іх усе адсталі і ў краіне была нармальная сітуацыя, каб быў мір. Усё астатняе, як кажуць украінцы, мы знойдзем самі, сваёй працай», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Таму, чаго б нам гэта ні каштавала, трэба захаваць мір на нашай зямлі, забяспечыўшы бяспечнае жыццё нашага народа і абараніўшы той кавалак зямлі, які дастаўся нам у спадчыну», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

## Парламенцкі дзённік

# ЗНАЙСЦІ КУЛЬТУРНЫ КАМПРАМІС

**У ПАЛАЦЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ АБМЕРКАВАЛІ СПРЭЧНЫЯ ПЫТАННІ ПРАЕКТА КОДЭКСА АБ КУЛЬТУРЫ**

**Праца над праектам Кодэкса аб культуры працягваецца. На апошнім пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы абмяркоўвалі, як будзе пацвярджацца статус творчага работніка, хто павінен выдаваць адпаведны сертыфікат, у які тэрмін неабходна вяртаць кошт білетаў на адмененыя культурныя мерапрыемствы? Планууецца, што праект Кодэкса перададуць для ўзгаднення зацікаўленым бакам ужо ў канцы лютага.**

### Хто дасць сертыфікат?

У пасяджэнні прынялі ўдзел не толькі дэпутаты вышэйназванай камісіі, але і члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі зацікаўленых міністэрстваў — у прыватнасці, міністр культуры Барыс Святлоў, намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч, а таксама старшыні творчых саюзаў.

— Абмяркоўвалася важная норма — пацвярджэнне статусу творчага работніка, — падкрэсліла ў размове з журналістамі **Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы.** — Мы павінны прыйсці да кампраміснага рашэння і забяспечыць выкананне інтарэсаў дзяржавы і творчых людзей, каб апошнія мелі магчымасць пацвярдзіць свой статус. Такая працэдура павінна быць, і сертыфікат творчым людзям патрэбны ў тым ліку і ў сувязі з Дэкрэтам аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства — творчы чалавек, які пацвердзіў свой статус, лічыцца ўдзельнікам фінансавання дзяржаўных выдаткаў.

Як адзначыла дэпутат, сертыфікат павінен будзе выдавацца незалежна ад таго, з'яўляецца чалавек членам творчага саюза ці не.

Падчас абмеркавання праекта Кодэкса ўдзельнікі шукалі вырашэнне шэрагу пытанняў. Калі існуе два творчыя саюзы аднаго профілю — у які звяртацца чалавеку? Ці будзе выдача сертыфіката адміністрацыйнай працэдурай? Ці хопіць у творчых саюзаў рэсурсаў для таго, каб у вызначаны заканадаўствам тэрмін выдаць грамадзяніну такі сертыфікат? Хто будзе ажыццяўляць кантроль за наданнем статусу творчага работніка? У выпадку пацвярджэння статусу творчага работніка творчым саюзам — як быць, калі апошні распускаецца?

Кіраўнікі творчых саюзаў звярнулі ўвагу на той факт, што з прыняццем Дэкрэта аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства ў творчыя саюзы пачалі звяртацца людзі, якія па сутнасці не займаюцца творчай дзейнасцю ў поўным сэнсе гэтага слова, але жадаюць стаць членамі такога саюза, каб не плаціць падатак.

**Рыгор СІТНІЦА, старшыня Беларускага саюза мастакоў,** звярнуў увагу на яшчэ адзін спрэчны момант:

— Мы з'яўляемся грамадскімі арганізацыямі, і ў нашых статутах не прапісаны нормы, якія дазвалялі б нам браць на сябе дзяржаўныя функцыі. Выдача дзяржаўнага сертыфіката — гэта не абавязак грамадскай арганізацыі.

### Грошы за адменены канцэрт вернуць хутчэй

— На рабочай групе мы разглядалі прапановы Міністэрства гандлю ў праект Кодэкса аб культуры, што тычацца абароны правоў спажыўцоў — у прыватнасці, вяртанне кошту білетаў на тыя відовішчныя мерапрыемствы, якія былі адменены, — паведаміла Наталля Кучынская.

У цяперашні час максімальны тэрмін вяртання кошту квіткоў не ўстаноўлены, з-за чаго людзі часам не могуць вярнуць свае грошы на працягу некалькіх месяцаў. На пасяджэнні прапаноўвалася два тэрміны вяртання — 14 дзён або адзін месяц.

**Сертыфікат павінен будзе выдавацца незалежна ад таго, ці з'яўляецца чалавек членам творчага саюза.**

Адна з прапаноў тычылася і таго, што арганізатары культурных відовішчных мерапрыемстваў павінны пры неабходнасці забяспечыць на іх арганізацыю аказання медыцынскай дапамогі.

— Трэба будзе прадумаць і змены ў Адміністрацыйны кодэкс у той частцы, што тычыцца адказнасці за парушэнне заканадаўства аб культуры, — падкрэсліла дэпутат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### «ЗАДЗІРАЦЬ» ЦЭНЫ НЕ ДАЗВОЛІЦЬ КАНКУРЭНЦЫЯ

**Увогуле, начальнік упраўлення эканомікі, фінансаў і цэн Міністэрства гандлю Павел ФІЛІПАЎ лічыць, што рэзкага павелічэння коштаў у нашай краіне не прадбачыцца.**

Спецыяліст упэўнены, што ў сённяшняй сітуацыі сур'ёзных цэнавых ваганняў не будзе. Далей ён патлумачыў, што калі будзе моцна павышана цана, то пакупнік проста пойдзе ў суседнюю краму і купіць тавар па цане, якая яго задаволіць. Паводле яго слоў, сітуацыю стабілізуе канкурэнцыя, бо на спажывецкім рынку Беларусі прадстаўлены шырокі спектр вытворцаў і вялікі асартымент тавараў. «У нас дастатковае насычэнне рынку, створана добрае канкурэнтнае асяроддзе. Тыя ж гандлёвыя сеткі будуць канкураваць паміж сабой па тых ці іншых групах тавараў рознымі акцыямі. І мы ўжо неаднаразова падобнае назіралі», — удакладніў сваю пазіцыю Павел Філіпаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### 9 МЕДАЛЁЎ І ДРУГОЕ КАМАНДНАЕ МЕСЦА

**Каманда ліцэістаў БДУ заваявала другое месца на XII міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы ў Казахстане. Другую прыступку беларусы падзялілі са зборнай спецыялізаванага навучальнага навуковага цэнтра пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М.В. Ламаносава.**

Высокія вынікі паказалі ліцэісты БДУ і ў асабістым заліку. На іх рахунку дзевяць медалёў рознай вартасці. «Золата» па фізіцы ўдастоены Багдан Звяжынскі, а па інфарматыцы — Міхаіл Наталевіч. «Серабро» па фізіцы — у Яна Лагоўскага і Глеба Фядзюшкіна, па матэматыцы — у Ілы Пчалінцава, а па інфарматыцы — у Юрыя Бандарчука. Бронзавымі прызёрамі па фізіцы сталі Андрэй Крыштолік, па матэматыцы — Святлана Шабан і Аляксандр Юран.

Унікальнае інтэлектуальнае спаборніцтва працягвае традыцыі ўсесаюзных алімпіяд і дае ўдзельнікам унікальны шанц для далейшага росту і развіцця здольнасцяў да дакладных навук. Беларусь на Жаўтыкаўскай алімпіядзе не першы год прадстаўляюць толькі выхаванцы Ліцэя БДУ. Усяго ў алімпіядзе ўдзельнічалі 63 каманды з 17 краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ПАБУДАВАЛІ НА ЧВЭРЦЬ БОЛЬШ... ЗАПЛАНАВАНАГА

**Летась арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці ў краіне было пабудавана 55,5 тысячы новых кватэр, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Усяго за мінулы год уведзена ў эксплуатацыю 5 млн 58,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 126,5% да прадугледжанага задання на год.**



Спецыялісты Белстата ўдакладняюць, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку па паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 2 млн 4,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 39,6% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для чаргавікоў пабудавана з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі 1 млн 612,8 тысячы «квадратаў», а ў шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 1 млн 163 тысячы квадратных метраў. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 513,9 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 29,9% ад агульнага ўводу па краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### АКВАПАРК У КРАСНАПОЛЛІ

**У раённым цэнтры ўводзіцца першая чарга фізкультурна-аздараўленчага комплексу.**

Гэта знамянальная падзея адбудзецца ўжо сёння. Для гарадскога пасёлка з насельніцтвам каля 6 тысяч чалавек зроблены шыкоўны падарунак. З 2013 года па чарнобыльскай праграме тут будуецца двухпавярховы ФАК з басейнам, дзіцячым аквапаркам, заламі для заняткаў барацьбой і боксам, трэнажорнай залай. Басейн і дзіцячы аквапарк ужо гатовыя.

— Гэта вельмі значная для нас падзея, — кажа **намеснік старшыні Краснапольскага райвыканкама Алена ЧАЮКОВА.** — Спартыўны аб'ект вырашыць такія дзве важныя праблемы ў раёне, як аздараўленне насельніцтва і стварэнне новых працоўных месцаў. А ў нашых юных спартсменаў, якія выступаюць за гонар раёна на круглагадовых спартакіядах, з'явілася добрая магчымасць палепшыць вынікі па плаванні.

Раённыя ўлады таксама разлічваюць на цікавасць да іх аб'екта расійскіх гасцей. Бо, напрыклад, для Браншчыны найбліжэйшы дзіцячы аквапарк менавіта тут, у Краснаполлі, а гэта добрая магчымасць прыехаць сюды адпачыць адразу ўсёй сям'ёй.

Агульны кошт аб'екта ацэньваецца ў 109 мільярдаў рублёў. Канчатковы ўвод у эксплуатацыю запланаваны на гэты год. У Краснаполлі лічаць, што адкрыццё ФАКа стане адной з важных прыступак для далейшага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

### ЭКАНОМІЯ НА АСВЯТЛЕННІ... СУПРАЦЬ АВАРЫЙ

**Пры дапамозе новай сістэмы вонкавага асвятлення на вуліцы Ваўпшасава ў сталіцы летась удалося знізіць колькасць уліковых дарожна-транспартных здарэнняў у начны час сутак да нуля.**

— Як вядома, для эканоміі электраэнергіі ў горадзе пасля поўначы, калі назіраецца нізкая інтэнсіўнасць дарожнага руху, вулічнае асвятленне працуе па прынцыпе «2-1-2»: дзве апоры не працуюць, адна ўключана, — расказала **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — На ўчастку вуліцы Ваўпшасава ад Даўгабродскай да Радыяльнай яшчэ ў пачатку мінулага года звычайныя лямпы асвятлення былі заменены на лямпы, магутнасць якіх падае ца рэгуліроўцы. Такая сістэма дазваляе ў начны час не адключаць ліхтары, а проста змяншаць іх яркасць. Такім чынам адбываецца зніжэнне спажывання электраэнергіі, а асвятленне застаецца раўнамерным на ўсіх участках праезнай часткі, што становіцца адбіваецца на бяспецы дарожнага руху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Сапраўдныя таленты

# ЗАПАЛІЦЬ АГОНЬ...

**Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па эканамічных пытаннях Кірыл РУДЫ. Першы намеснік міністра эканомікі нашай краіны Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ. Начальнік упраўлення інфармацыі Міністэрства замежных спраў, прэс-сакратар Дзмітрый МІРОНЧЫК. Дырэктар навуковай установы «Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны», кандыдат фізіка-матэматычных навук Андрэй КУЗЬМІН. Кіраўнік кампаніі «ЯндексБел» Аляксей СІКОРСКІ. Шматразовы чэмпіён сусветных спаборніцтваў па праграмаванні (і сярод школьнікаў, і сярод студэнтаў, і сярод найбуйнейшых ІТ-карпарацый) Генадзь КАРАТКЕВІЧ. Як вы думаеце, што агульнага паміж гэтымі людзьмі?**

На ўрачыстым сходзе, прысвечаным 20-годдзю стварэння спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, стала вядома, што ўсе яны ў розныя гады станавіліся стыпендыятамі і лаўрэатамі фонду. А ўсяго за 20 гадоў дзейнасці фонду яго ўзнагародамі былі адзначаны больш за 30 тысяч навучэнцаў і студэнтаў. І калі б са сцэны паспрабавалі расказаць пра дасягненні кожнага з іх, то не хапіла б і цэлага месяца...

Ідэя стварэння фондаў па падтрымцы адоранай і таленавітай моладзі нарадзілася ў няпросты для нашай краіны час. У сярэдзіне 1990-х заняткі навуковымі даследаваннямі і творчасцю станавіліся ўсё менш прэстыжнымі. А найлепшыя выпускнікі ВНУ імкнуліся з'ехаць працаваць за мяжу. Сёння стыпендыяты і лаўрэаты фонду, якія дасягнулі высокіх вяршынь у сваёй кар'еры, канстатуюць, што прызнанне іх заслуг у самым пачатку жыццёвага і прафесійнага шляху стала істотнай падтрымкай, моцным стымулам і нават штуршком для ўпэўненага руху наперад.

— Для мяне, напрыклад, стыпендыя фонду адкрыла калісьці магчымасць для наведвання гістарычных архіваў у Расіі і іншых краінах, — расказвае **першы прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, доктар гістарычных навук, дацэнт Дзмітрый ЛАЎРЫНОВІЧ.**

Кірыл Руды правёў паралель паміж стыпендыятамі прэзідэнцкага фонду па падтрымцы адоранай моладзі і героямі казкі Андэрсена пра свечку: «Толькі калі свечку запалілі, усе ўбачылі, якая яна прыгожая. Таксама і з маладымі людзьмі: трэба запаліць у іх агонь, каб ён свяціў і іншым...»

**Стыпендыяты і лаўрэаты фонду, якія дасягнулі высокіх вяршынь у сваёй кар'еры, канстатуюць, што прызнанне іх заслуг у самым пачатку жыццёвага і прафесійнага шляху стала моцным стымулам.**

Званне стыпендыята і лаўрэата прэзідэнцкага фонду — гэта не проста ўзнагарода, а знак таго, што дзяржава бярэ на сябе адказнасць за далейшае прафесійнае станаўленне маладога таленту — школьніка або студэнта. Лёс кожнага лаўрэата ўважліва адсочваецца і пасля яго ўступлення ў дарослае жыццё. Гэта робіцца для таго, каб стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для самарэалізацыі асобы з найбольшай карысцю для краіны. Маладым людзям аказваецца падтрымка ў выбары працоўнага месца, у вырашэнні жыллёвых і іншых матэрыяльных праблем, а таксама ў пытаннях, звязаных з іх станаўленнем у жыцці.

**Старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта, рэктар Белдзяржуніверсітэта акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА** адзначыў, што школьнікі і студэнты заахвочваюцца за дасягненні па самых розных напрамках: ад інфармацыйных тэхналогій да матэматыкі або медыцыны. Не менш важныя і гуманітарныя навукі. Сяргей Абламейка паведаміў, што калі па першым часе дзейнасці фонду заахвочваліся цягам года некалькі сотняў чалавек, то ў апошні гады іх колькасць штогод перавышае 2300 чалавек.



Фота БЕЛТА.

**Ліцэісты БДУ, якія ўдзельнічалі ў Жаўтыкаўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы, — стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Гандбол. Еўра-2016

MEN'S EHF EURO 2016 POLAND

# ПРАЙГРАЛІ ЧЭМПІЁНАМ

## Наша гандбольная зборная працягвае барацьбу ў асноўным раўндзе

**Напярэдадні беларускія гандбалісты пераехалі з Катавіц у Кракаў, менавіта там праходзіць барацьба асноўнага раўнда чэмпіянату Еўропы для падапечных Юрыя Шаўцова. Першы сапернік быў сапраўды грозны і тытулаваны. Французы — чэмпіёны свету і Еўропы, пераможцы Алімпіяды-2012, з першых хвілін сустрэчы яны дыктавалі сваю гульню. Супрацьстаянне варатароў — мабыць, так можна ахарактарызаваць пачатак матча; наш Салдаценка і французскі Амея аж да чацвёртай хвіліны сустрэчы трымалі свае вароты на замку, і першы саступіў малады беларус.**




У стартавай палове гульні ў нашых хлопцаў зусім нічога не атрымлівалася ў атацы, абарона французаў была мацнейшай, яны дзейнічалі хутчэй і больш эфектыўна, адкрыць лік Барысу Пухоўскаму ўдалося толькі на сёмай хвіліне сустрэчы, і то з сяміметровага кідка. Юрый Шаўцоў пачаў праводзіць пераcтаноўкі па пазіцыях, але і гэта не дало вынікаў: лік пасля першага тайма — 20:5. Пагадзіцеся, такія лічбы на табло нават пры наяўнасці настолькі грознага саперніка выглядаюць, мякка кажучы, не вельмі прыстойна. Да перапынку вынік матча стаў зразумелы, таму пасля паўзы французскі трэнер Клод Анеста выпусціў на пляцоўку другі склад — правіць сябе атрымала шанц і беларуская моладзь.

Выніковыя лічбы — 34:23 — не на нашу карысць. Спадзяёмся, што галоўныя бітвы ў дружыны Шаўцова яшчэ наперадзе: у панядзелак нам будуць супрацьстаяць палякі, а ў сераду — бой з македонцамі.

***Юрый ШАЎЦОЎ:***

*— У першым тайме ў нас былі вялікія праблемы ў нападзенні — з-за таго, што французы выдатна дзейнічалі ў абароне. Сапернік быў нашмат хутчэйшы, таму нашы хлопцы і не змаглі рэалізаваць той план у атацы, што мы задумвалі на гэтую гульню. Трэба адзначыць, што такія паражэнні не б'юць, а вучаць; падобныя матчы вельмі важныя для нашага далейшага развіцця. Мы ўсе павінны мець цярпенне. Трэба пачакаць, пакуль нашы гандбалісты вырастуць і пачнуць гуляць на іншым узроўні.*

***Аляксей ХАДКЕВІЧ:***

*— Падобныя гульні з'яўляюцца сапраўды неацэнным вопытам для нас. Усё ж такі не кожны дзень можна дзевяць мячоў пакласці ў вароты чэмпіёну свету, Еўропы і Алімпійскіх гульняў. На мой погляд, такія сустрэчы трэба разглядаць як чарговую прыступку, якую трэба перадолець. Гэты крок дапаможа вырасці ў гандбаліста добрага ўзроўню.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Азбука бяспекі

# МОЦНЫЯ ХАЛАДЫ

### МНС разаслала тэлефанаграму

Багаты на арктычныя халады студзень выдаўся вельмі гарачым для ратаўнікоў — за першыя тры тыдні ад пажараў загінулі 84 чалавекі! Сіноптыкі ж прагназуюць, што ў гэтыя выхадныя слупок тэрмометра па начах мае ўсе шанцы апусціцца да мінус 27 градусаў. Таму Міністэрства па надзвычайных сітуацыях разаслала тэрміновую тэлефанаграму ў рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання. У ёй пералічаны дадатковыя захады, якія неабходна прыняць для таго, каб максімальна бяспечна перажыць моцныя маразы і разам з тым забяспечыць устойлівае функцыянаванне аб'ектаў жыццядзейнасці.

— Што гэта за захады? Трэба быць максімальна падрыхтаванымі да таго, каб аварыйныя брыгады неадкладна змаглі выправіцца на ліквідацыю магчымых аварый у цепла- і электразабеспячэнні, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Насельніцтва краіны будзе аператыўна інфармавацца аб небяспечнай тэмпературы паветра і атрымае рэкамендацыі па правільных паводзінах у маразы. Адказныя асобы павінны дзяжурыць на тых аб'ектах, дзе масава збіраюцца людзі, і без якіх немагчымая нармальная жыццядзейнасць людзей.

Асабліва не рады моцным маразам аўтамабілісты — у бензабаку замярзае дызельнае паліва. Гэтая фізічная асаблівасць у такое надвор'е рызыкуе стаць фатальнай. Таму МНС скіроўвае ўвагу канцэрна «Белнафтахім» на тое, што на аўтазапраўках мусіць прадавацца спецыяльнае паліва «Арктыка».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### Цеплавізары супраць інфекцыі

Цеплавізары, якія дазваляюць выяўляць вірусныя інфекцыі на ранніх стадыях, усталяваны ў буйных пунктах пропуску на беларуска-ўкраінскай мяжы.

**Галоўны ўрач абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр ТАРАСЕНКА** расказвае, што калі хворы чалавек перасякае мяжу, у яго адразу ж будзе выяўлена высокая тэмпература. Ну а далей грамадзяніна агледзяць медыкі хуткай дапамогі. Варыянт шпіталізацыі не выключаецца.

Пры тым, што ў некаторых абласцях Украіны зарэгістраваны высокі ўзровень захворвання на рэспіраторныя інфекцыі, на Гомельшчыне ад грыпу прышчэплены прыкладна 41% насельніцтва. У склад апошняй вакцыны былі ўключаны некалькі штамаў грыпу, у тым ліку H1N1. Пакуль што ў вобласці зарэгістраваны толькі адзінкавыя выпадкі захворвання. Каб адказаць на пытанні насельніцтва, звязаныя з распаўсюджваннем магчымых вірусных інфекцый, спецыялісты Гомельскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правялі акцыю ў адной з буйных крам абласнога цэнтра.

**Урач-эпідэміёлаг Алена ПЕТРУШКЕВІЧ** адзначае, што ва Украіне вельмі мала людзей напярэдадні атрымалі прышчэпкі ад грыпу:

— Да таго ж, там платная медыцына. Эканамічныя праблемы прымушаюць людзей позна звяртацца да ўрачоў, у выніку шмат ускладненняў.

Летась на брэсцкім участку мяжы было выяўлена 10 чалавек, якія захварэлі на вірусную інфекцыю. Сёлета пакуль не зафіксавана ніводнага выпадку перасячэння мяжы чалавекам з высокай тэмпературай.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### Пры непагадзі паклапаціся пра сябе

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нагадвае грамадзянам пра неабходнасць захавання правілаў асабістай бяспекі — каб не стаць ахвярай марозу і моцнага ветру.

Важна памятаць, што небяспеку абмаражэння ствaрае не толькі мінусавая тэмпература, але і вільготнасць паветра і сіла ветру. Чым вышэйшая вільготнасць, чым мацнейшы вецер, тым больш шанцаў атрымаць абмаражэнне. Пры такім надвор'і трэба правільна рыхтавацца да выхаду на мароз.

Адзенне павінна быць шматслойным. Чым больш слаёў, тым больш і праслоек паветра — а яно добра ўтрымлівае цяпло. Але пры гэтым адзенне не павінна быць цесным — гэта робіць цяжкім прыток крыві, асноўнага пастаўшчыка цяпла знутры. Абутак таксама не павінен ціснуць, бо тады цыркуляцыя крыві замаруджваецца. Пальцы ў абутку павіны свабодна рухацца. Перад выхадам з дому абутак трэба начысціць тлустым крэмам — той не дасць яму прамокнуць. Надзеньце ваўняныя шкарпэткі, устаўце тоўстыя вусцілкі.

Абавязковая ўмова — пальчаткі ці рукавіцы. Апошні варыянт больш правільны. Памятайце, што, калі рукі голыя — можна згубіць да 17 працэнтаў цяпла. Шапка таксама не павінна быць цеснай — трэба, каб яна закрывала вушы. Шыю і нават твар абараніце шалікам рыхлай вязкі.

Тыя ўчасткі скуры, якія засталіся непрыкрытымі ці могуць агаліцца, напрыклад, падчас хадзьбы, абавязкова трэба апрацаваць тлустым крэмам — ён падтрымае здольнасць скуры ўтрымліваць вільгаць. Вусны намажце гігіенічнай памадай.

І яшчэ. Галодны чалавек замярзае нашмат хутчэй. Правільнае харчаванне — адзін з лепшых спосабаў папярэдзіць абмаражэнне і аднавіць арганізм пасля холаду. Ежа павінна быць цёплай (гэта забяспечыць дадатковы прыліў сіл адразу), а таксама каларыйнай, што надасць энергіі пасля. Ужываць трэба толькі цёплыя саграваальныя напоі — напрыклад, гарбату. Грэцца алкаголем да выхаду на холад, а таксама падчас уздзеяння холаду, нельга: алкаголь толькі пагаршае адчувальнасць і не дае магчымасці аб'ектыўна ацэньваць уласны стан. Курыць на марозе таксама забаронена, бо гэта выклікае спазм капіляраў на доўгі час і пагаршае цыркуляцыю крыві.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Счастливая покупка-4»

**Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Счастливая покупка-4» (далее – Игра или рекламная игра).**

**1. Организатор**

1.1. Организатором рекламной игры является Совместное общество с ограниченной ответственностью «КонтеТрейд», УНП 590701005 (далее – Организатор), зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №590701005. Юридический адрес Организатора: Республика Беларусь, 230026, г. Гродно, ул. Победы, 30.

**2. Наименование рекламной игры**

2.1. Настоящая рекламная игра называется «Счастливая покупка-4».

**3. Территория проведения рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания рекламной игры**

4.1. Рекламная игра проводится с 1 февраля 2016 г. по 20 мая 2016 г.

**5. Цель проведения рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования продаж продукции торговых марок «Conte elegant», «Conte-kids», «DIWARI», произведенной СООО «Конте Спа».

**6. Комиссия по проведению рекламной игры**

6.1. Для проведения Игры Организатор создает комиссию по проведению рекламной игры (далее – Комиссия) в следующем составе:

Председатель Комиссии – Степанов Борис Борисович, СООО «Конте Спа», менеджер по информационным технологиям;

Члены Комиссии:

Петровский Евгений Михайлович, СООО «КонтеТрейд», директор;

Розум Мария Николаевна, СООО «Конте Спа», специалист по маркетингу;

Квашнина Ксения Вячеславовна, СООО «Конте Спа», специалист по рекламе;

Жигало Анастасия Евгеньевна, СООО «КонтеТрейд», экономист.

**7. Участники рекламной игры**

7.1. В рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.2. Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**8. Порядок участия в рекламной игре**

8.1. Для участия в рекламной игре участнику в период с 1 февраля 2016 г. по 31 марта 2016 г. включительно необходимо выполнить следующие действия:

8.1.1. приобрести продукцию торговых марок «Conte elegant», «Conte-kids», «DIWARI» (далее — Игровая продукция), произведенную СООО «Конте Спа»;

8.1.2. вырезать только с ЛИЦЕВОЙ СТОРОНЫ индивидуальных упаковок Игровой продукции логотипы любых торговых марок: «Conte elegant», «Conte-kids», «DIWARI»;

8.1.3. вложить вырезанные логотипы в количестве 3 (три) штуки в почтовый конверт;

8.1.4. на почтовом конверте разборчиво написать следующие данные:

1) фамилия, имя, отчество (полностью, без сокращений);

2) точный почтовый адрес: почтовый индекс (желательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), квартира (при наличии);

3) номер мобильного телефона в международном формате и название оператора (velcom, ПРИВЕТ, МТС, life:) (номер телефона и название оператора можно вложить внутрь конверта). Участники, не указавшие номер своего мобильного телефона, не могут претендовать на выигрыш Призов второй категории.

8.1.5. отправить письмо Организатору по адресу: 230026, г. Гродно, а/я «Счастливая покупка».

8.2. За каждые три единицы Игровой продукции, приобретенной в интернет-магазине http://conteshop.by/ (далее интернет-магазин), полностью оплаченной и полученной, покупатель в интернет-магазине получает один уникальный номер покупки, представляющий из себя шестизначный порядковый номер, дополненный префиксом “CS” (далее – уникальный номер покупки).

В период с 01.02.2016 по 02.04.2016 (включительно) участники, получившие в интернет-магазине уникальные номера покупок, имеют дополнительную возможность принять участие в Игре без необходимости направлять в адрес Организатора письма с логотипами путем активации уникальных номеров покупок при условии, что в профиле участника в интернет-магазине указаны следующие данные об участнике:

- фамилия, имя, отчество (полностью, без сокращений);

- точный почтовый адрес: почтовый индекс (желательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), квартира (при наличии);

- дата рождения;

- номер мобильного телефона в международном формате и название оператора (velcom, ПРИВЕТ, МТС, life:). Участники, не указавшие номер своего мобильного телефона, не могут претендовать на выигрыш Призов второй категории.

Активация уникального номера покупки производится участником в профиле интернет-магазина на закладке «Счастливая покупка(промоакция)» путем выбора уникального номера покупки (одного или нескольких) и нажатия кнопки «Участвовать в игре». Каждый уникальный номер покупки может быть активирован участником только один раз.

8.3. К участию в рекламной игре не принимаются:

8.3.1. письма, полученные Организатором ранее 1 февраля 2016 г. и позднее 2 апреля 2016 г. (дата получения определяются по почтовому штемпелю получения);

8.3.2. письма, отправленные по почте не с территории Республики Беларусь (пункты отправления определяются по почтовому штемпелю отправления на конверте);

8.3.3. письма, в которых указано два и более участника рекламной игры;

8.3.4. письма, заполненные неразборчиво либо не в соответствии с пунктом 8.1.4. настоящих Правил.

8.4. Каждый участник Игры может принимать участие в Игре неограниченное количество раз при условии покупки нужного количества Игровой продукции и выполнения требований, необходимых для участия в Игре.

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора в размере 629886000 (шестьсот двадцать девять миллионов восемьсот восемьдесят шесть тысяч) белорусских рублей.

9.2. Призовой фонд состоит:

*Таблица №1. Призовой фонд рекламной игры*

| № | Категория приза | Наименование | Количество призов | Сумма, бел. руб. | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Главный приз | Денежное вознаграждение в размере 100 000 000 белорусских рублей | 2 | 100 000 000 | 200 000 000 |
| 2. | Приз первой категории | Денежное вознаграждение в размере 1 000 000 белорусских рублей | 200 | 1 000 000 | 200 000 000 |
| 3. | Приз второй категории | Денежное вознаграждение в размере 100 000 белорусских рублей на счет абонентского номера оператора сотовой связи победителя и денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога в сумме 14 943 белорусских рубля | 2000 | 100 000<br>14 943 | 200 000 000<br>29 886 000 |
| Итого | | | | | 629 886 000 |

**10. Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, порядок определения победителей рекламной игры**

10.1. Розыгрыши призового фонда проводятся по адресу: Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Замковая, д. 7, ком. СООО «КонтеТрейд».

10.2. Розыгрыши призов проводятся 3 марта 2016 г. и 6 апреля 2016 г.:

*Таблица №2. Розыгрыши призов*

| Розыгрыш № | Дата и время розыгрыша | В розыгрыше участвуют: письма, полученные в период | В розыгрыше участвуют: уникальные номера покупок, полученные в интернет-магазине conteshop.by, активированы в период | Наименование приза | Количество призов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 03.03.2016 9.00 | 01.02.2016-29.02.2016 | 01.02.2016-29.02.2016 | Главный приз | 1 |
| | | | | Приз первой категории | 100 |
| | | | | Приз второй категории | 1000 |
| 2. | 06.04.2016 9.00 | 01.03.2016-02.04.2016 | 01.03.2016-02.04.2016 | Главный приз | 1 |
| | | | | Приз первой категории | 100 |
| | | | | Приз второй категории | 1000 |




**10.3. Механика проведения розыгрышей**

10.3.1. До проведения розыгрышей все письма, поступающие в адрес Организатора, проверяются на соответствие требованиям, изложенным в пунктах 8.3.1-8.3.4 настоящих Правил, за исключением наличия на конверте (либо внутри конверта) информации о номере мобильного телефона участника и названии оператора. Каждому письму, допущенному к участию в рекламной игре, присваивается 6-значный порядковый номер (далее – Уникальный номер письма), который проставляется на конверте письма. Нумерация писем осуществляется Организатором по дате их поступления из отделения почтовой связи.

10.3.2. Все случаи активации уникальных номеров покупок (при условии соблюдения требований, изложенных в п.8.2. настоящих Правил) по дате их активации регистрируются в журнале. Организатор накануне проведения розыгрыша формирует список Уникальных номеров покупок, участвующих в розыгрыше, дополненный персональными данными Участников, совершивших эти покупки (далее – Список уникальных номеров покупок).

10.3.3. В день проведения розыгрыша Организатор распечатывает список Уникальных номеров писем и покупок, участвующих в розыгрыше (далее – Список для розыгрыша). Все печатные страницы Списка для розыгрыша пронумеровываются в порядке возрастания без пропуска номеров. Каждая печатная страница содержит 6 (шесть) столбцов и 50 (пятьдесят) строк, пересечение которых образует ячейку (на одной печатной странице содержится 300 (триста) ячеек). Все ячейки на одном листе пронумеровываются от 1 (одного) до 300 (трехсот) (далее – номер ячейки на странице). Вначале нумеруются все ячейки первого столбца, затем второго и т.д. В каждую ячейку заносится один Уникальный номер письма либо Уникальный номер покупки (далее – Уникальный номер). Уникальные номера покупок располагаются в списке после Уникальных номеров писем.

10.3.4. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице №2 пункта 10.2 Правил.

10.3.5. Определение выигрышных Уникальных номеров и выявление участников, приславших письма либо совершивших покупки в интернет-магазине, соответствующих выигрышным Уникальным номерам, проводится в несколько этапов:

10.3.5.1. При розыгрыше Главного приза и Призов первой категории:

Вначале определяется номер страницы Списка для розыгрыша. Для этого в лототрон засыпаются и перемешиваются карточки с номерами страниц, соответствующих количеству печатных страниц Списка для розыгрыша. Один из членов Комиссии случайным образом выбирает карточку, содержащую номер печатной страницы.

Затем для выбранной страницы определяется номер ячейки на странице. Для этого в лототрон засыпаются и перемешиваются карточки с номерами от 1 (одного) до 300 (трехсот). В случаях, если на предыдущем этапе была выбрана последняя страница Списка для розыгрыша, в лототрон засыпаются карточки с номерами ячеек, которые на последней странице Списка для розыгрыша заполнены Уникальными номерами. Один из членов Комиссии случайным образом выбирает карточку, содержащую номер ячейки на странице.

Уникальный номер, находящийся в выбранной ячейке, признается выигрышным.

10.3.5.2. При розыгрыше Призов второй категории:

В лототрон засыпаются и перемешиваются карточки с номерами от 1 (одного) до 300 (трехсот). Один из членов Комиссии случайным образом выбирает карточку, содержащую номер ячейки на странице.

Выигрышными последовательно признаются Уникальные номера, находящиеся в выбранной ячейке на страницах Списка для розыгрыша.

Если выбранных таким способом Уникальных номеров не хватает для полного розыгрыша Призов второй категории, один из членов Комиссии случайным образом выбирает следующую карточку, содержащую номер ячейки на странице.

10.3.5.3. В ходе розыгрыша призов Уникальный номер может признаваться выигрышным только один раз. В случае повторного выпадения Уникального номера:

при розыгрыше Главного приза и Призов первой категории один из членов Комиссии вытягивает из лототрона следующую карточку с номером ячейки на странице;

при розыгрыше Призов второй категории выигрышным признается Уникальный номер в следующей по порядку ячейке.

10.3.5.4. Если выигрышный Уникальный номер является Уникальным номером письма, то соответствующее ему письмо проверяется членами Комиссии на соответствие требованиям пункта 8 настоящих Правил. Для Призов второй категории наличие информации о номере мобильного телефона участника на конверте(либо внутри конверта) является обязательным для признания Уникального номера выигрышным.

В случае несоответствия письма вышеназванным требованиям оно исключается из розыгрыша, а выигрышный Уникальный номер признается недействительным.

При отсутствии на конверте (либо внутри конверта) информации о наименовании оператора сотовой связи (velcom, ПРИВЕТ, МТС, life:) Организатор самостоятельно определяет оператора в соответствии с Таблицей 3:

*Таблица 3. Определение операторов по номеру телефона*

| № | Телефон в международном формате | Наименование сотового оператора |
|---|---|---|
| 1 | +**375 25** xxx xx xx | life :) |
| 2 | +**375 29 1**xx xx xx ; +**375 29 3**xx xx xx; +**375 29 6**xx xx xx; +**375 44 5**xx xx xx; +**375 44 7**xx xx xx; | Velcom |
| 3 | +**375 29 9**xx xx xx; +**375 44 4**xx xx xx | ПРИВЕТ |
| 4 | +**375 29 2**xx xx xx; +**375 29 5**xx xx xx; +**375 29 7**xx xx xx; +**375 29 8**xx xx xx; +**375 33** xxx xx xx | МТС |

Организатор также оставляет за собой право организовать информационный обмен с операторами сотовой связи (одним или несколькими) и на основе информации, полученной от операторов сотовой связи, при необходимости, откорректировать наименование оператора, указанного участником.

10.3.5.5. На основании информации, размещенной на конверте либо в Списке уникальных номеров покупок, соответствующему выигрышному Уникальному номеру, Организатор определяет победившего в розыгрыше участника рекламной игры.

10.3.6. Процедура определения выигрышных Уникальных номеров и выявления победителей повторяется до полного розыгрыша призов, участвующих в розыгрыше.

10.3.7. При проведении розыгрыша Призов первой категории Организатор дополнительно формирует резервный список, состоящий из 3 (трех) участников, в который включаются первые три победителя, выигравшие Призы первой категории. Случаи использования резервного списка описаны в пункте 12.6. настоящих Правил.

10.3.8. При возникновении сомнений в подлинности присланных участниками логотипов Игровой продукции, Организатор оставляет за собой право произвести экспертизу с целью определения их подлинности.

10.3.9. При проведении каждого розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

10.3.10. Участники рекламной игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

**11. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша**

11.1. Организатор в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения розыгрыша уведомляет победителей письмом, высланным по адресу, указанному участником на конверте либо адресу, указанному участником в профиле интернет-магазина. Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер телефона, указанный участником на конверте либо в профиле интернет-магазина, звонком по телефону и др.

**12. Порядок получения выигрышей**

12.1. Для получения Главного приза и Призов первой категории победитель должен в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения розыгрыша предоставить Организатору следующие личные данные:

а) копию страницы 25, страниц 31-33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

б) копию страницы 3, страниц 15-17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь.

12.2. Информация, указанная в пункте 12.1., предоставляется победителем одним из следующих способов:

а) письмом по почте по адресу: 230026, г. Гродно, ул. Победы, 30;

б) письмом на электронный почтовый ящик Организатора info@HappyBy.com

в) нарочно по адресу Организатора: г. Гродно, ул. Победы, 30.

12.3. Для осуществления контроля соблюдения со стороны Участников настоящих Правил Организатор имеет право потребовать от победителей, выигравших Призы второй категории, предоставление информации, указанной в п.12.1. Правил, которая должна быть предоставлена победителем в порядке, изложенном в п.12.2. Правил.

12.4. В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет подоходный налог с суммы приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

12.5. Денежная сумма Главного приза за вычетом подоходного налога с физических лиц передается победителю (при условии выполнения последним всех требований настоящих Правил) путем перечисления денежных средств на банковский счет, открытый на имя победителя. Банковский счет открывается в ОАО «Приорбанк» ЦБУ №600 по адресу: г. Гродно, ул. Мостовая, 37.

З 2013 года дамы №№28, 29, 30 па вуліцы Заслонава, №4 і 6 па вуліцы Будаўнікоў знаходзяцца ў камунальнай маёмасці горада, а будтрэст №12 валодае імі на праве бязвыплатнага карыстання.

— Мы выстаўляем жыхарам гэтых дамоў тарыфы, як для насельніцтва, а плацім за іх утрыманне пастаўшчыкам паслуг па расцэнках прадпрыемства — у некалькі разоў вышэй, — тлумачыць генеральны дырэктар будтрэста №12 Дзмітрый Марозаў. — На працягу года выдаткі па жыллі складаюць для нас мільярды. Пры тым, што там жывуць толькі адзінкі з нашых работнікаў. Што датычыцца непасрэдна дома №29 па вуліцы Заслонава, ён у аварыйным стане, і яго трэба знесці. Тым, хто ў нас працуе, мы прапануем інтэрнаты. Астатнія павінны пакінуць гэтае жыллё. Засталася 5 сем'яў, якія жывуць там беспадстаўна.

— Людзі кажуць, што гэтыя дамы пераявілі ў інтэрнаты на пачатку 2000-х.

— Гэтыя дамы — інтэрнаты. Менавіта пад такім статусам яны зарэгістраваны ў Агенцтве па дзяржаўнай нерухомасці і зямельным кадастры.

## ПАПЕРЫ І СВЕДКІ

Судовыя пасяджэнні праходзяць у Ленінскім судзе горада Магілёва індывідуальна, але пакуль не на карысць ісцоў. Сужэнцы Кандрашовы атрымалі магчымасць застацца толькі дзякуючы сваёй непаўналетняй дачцэ. Па законе балансатрымальнік не можа выселіць з інтэрната тых, хто 10 гадоў адпрацаваў на прадпрыемстве або мае дзяцей да 18 гадоў (артыкул 93 Жыллёвага кодэкса).

— Ордар на жылыя памяшканні, дзяржаўны акт на карыстанне зямлёй, архіўныя выпіскі аб прадстаўленні і абмене кватэр не сведчаць пра тое, што займанае жылое памяшканне з'яўляецца кватэрай, — падкрэсліла **Валянціна ЛАПАЦІНА, намеснік старшыні суда Ленінскага раёна Магілёва.** — Згодна з пунктам 1 артыкула 119 ЖК, інтэрнат — гэта жылы дом (яго частка), спецыяльна пабудаваны або пераабсталяваны для пражывання на перыяд працы або вучобы. А тое, што жылыя дамы №6 па вуліцы Будаўнікоў і №29 па вуліцы Заслонава з'яўляюцца інтэрнатамі, пацвярджаецца сведчаннямі аб дзяржаўнай рэгістрацыі і выпіскамі з рэгістрацыйнай кнігі «Аб правах, абмежаваннях правоў на капітальнае будаванне ад 26.11.2015 года». А таксама інвентарнымі і рэгістрацыйнымі справамі на гэтае капітальнае збудаванне ад 1959 года, дзе змяшчаюцца характарыстыкі гэтых збудаванняў. Яны ўказваюць на тое, што дом №29 па вуліцы Заслонава і №6 па вуліцы Будаўнікоў былі пабудаваны і выкарыстоўваліся, як **інтэрнаты**.

Аднак наконт прызначэння гэтых будынкаў маецца і іншае меркаванне. Пенсіянерка Марыя Пратасава з 1966 па 2007 год працавала ў ЖКК будтрэста №12 — спачатку маляром, а потым інспектарам па жылфондзе і майстрам. Ёй па роду заняткаў прыходзілася мець справу з тэхнічнымі пашпартамі на жылыя памяшканні.

— Так, першапачаткова гэтыя дамы сапраўды былі інтэрнатамі, але ў 1963 годзе атрымалі статус жылых дамоў з частковымі выгодамі, і туды людзей засялялі па ордарах, якія даваў не будтрэст, а выканкам, — сведчыць яна. — Аднак, у пачатку 2000-х з'явіліся новыя тэхпашпарты на гэтыя дамы, дзе яны ўжо мелі статус інтэрнатаў. Старыя тэхнічныя пашпарты кудысьці зніклі.

Марыя Пратасава пацвердзіла, што людзей здымалі з жыллёвай чаргі, калі ў іх хапала плошчы ў гэтых дамах без выгод. Яна спачувае людзям, якія трапілі ў складаную сітуацыю, і гатова сведчыць у судзе. На яе памяці толькі адна работніца будтрэста паспела прыватызаваць падобную кватэру і прадаць.


Жыльцы спадзяюцца, што іх дамы перастануць лічыць інтэрнатамі.

— У 90-х гадах некалькі дамоў, дзе не было выгод, трэст адрамантаваў, зрабіў там санвузлы і кухні, надбудаваў яшчэ адзін паверх, — расказвае Марыя Пратасава. — Былі намеры зрабіць рэканструкцыю і іншых дамоў па вуліцах Заслонава і Будаўнікоў, але не хапіла сродкаў. Трэст выдзяляў сем'ям дадатковыя пакоі для расшырэння і не забараняў рабіць там выгоды. Таму людзі і лічылі іх сваімі кватэрамі. Іх бацькі даўно памерлі, а ім, ужо таксама немаладым, цяпер нешта даказаць складана.

Трэба сказаць, што сітуацыя з магілёўскімі пасляваеннымі дамамі, якія першапачаткова былі без выгод, не ўнікальная. Такія дамы ёсць па ўсёй краіне. Пенсіянер Міхаіл Рыськоў, які доўгі час працаваў юрыстам у іншым магілёўскім будтрэсце, згадвае, што ў савецкія часы былі выпадкі, калі кіраўнікі прадпрыемстваў давалі кватэры ў інтэрнатах і наадварот — кватэры ў жылых дамах пераўтваралі ў пакоі часовага пражывання.

Аднак у інтэрнатах немагчыма было падзяліць асабовыя рахункі паміж жыльцамі аднаго памяшкання. Немагчыма было і абмяняць месца ў інтэрнаце на кватэру. Гэта варта было б улічваць у вырашэнні спрэчак вакол статусу такіх дамоў. На жаль, у цяперашнім Жыллёвым кодэксе такі нюанс не прадугледжаны, і **нашчадкі тых, хто ў 60-80-я гады атрымліваў неперспектыўнае жыллё, апынуліся перад фактам, што ісці ім няма куды.**

## НІ МЕТРАЎ, НІ ПРАВОЎ

— У савецкі час строгіх патрабаванняў да рэгістрацыі жылфонду, як сёння, не існавала. Меліся інвентарныя карты, у лепшым выпадку — тэхнічныя пашпарты, — кажа **Генадзь ЛЕБЕДЗЕЎ, загадчык сектара па рабоце са зваротамі грамадзян упраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама.** — Прычым тэхнічныя пашпарты і на жыллёвы дом, і на інтэрнат выдаваліся аднолькавыя. Адрозненне было толькі ў тым, што ў дагаворы найму жылля агаворвалася — інтэрнат гэта або жылы дом. У пачатку 2000-х гадоў у Беларусі пачалі прымацца меры па ўпарадкаванні рэгістрацыі жыллёвага фонду. У пастанове Саўміна №800 указваецца канчатковая дата, калі гэта трэба было зрабіць, — да 1 студзеня 2014 года. Па сантэхнічных патрабаваннях дамы па вуліцах Заслонава і Будаўнікоў нельга прызнаць жылымі, паколькі яны ўяўляюць з сябе доўгі калідор, па абодва бакі якога 12-14 пакояў на 2-3 кухні. Таму і зарэгістраваны яны як **інтэрнаты.**

На што могуць разлічваць жыхары дамоў па вуліцах Заслонава і Будаўнікоў (а гэта каля 40 сем'яў)? Яны звярнуліся да ўлад з прапановай дазволіць ім стварыць жыллёва-будаўнічы кааператыў. Для таго, каб яны змаглі пабудаваць іншае жыллё, ім патрэбна права на метры, у якіх яны пражываюць зараз, і льготны крэдыт. Улады не жадаюць ісці на такі кампраміс. Маўляў, людзі не стаяць на ўліку на атрыманне жылля, таму права на льготны крэдыт не маюць. Правоў на метры, дзе яны жывуць, таксама не можа быць, бо статус дамоў не дазваляе. Вельмі зручная для адпісак сітуацыя. Але што рабіць людзям?

Зрэшты, справа не толькі ў пэўнай інфантыльнасці і юрыдычнай неадукаванасці грамадзян. Тое, што такая колькасць людзей можа апынуцца на вуліцы — адказнасць таксама кіраўніцтва прадпрыемства і тых, хто кантралюе яго дзеянні. Цяпер, калі жыхары прапаноўваюць свае варыянты выйсця, другі бок абавязаны пачуць людзей і зрабіць так, каб інтарэсы грамадзян былі абароненыя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

***P.S.***
*Пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, жыхары атрымалі адказ на свой зварот у Магілёўскі аблвыканкам. У лісце гаворыцца, што дамы па вуліцы Заслонава №28, 29, 30 і іншыя па іх тэхнічных характарыстыках зарэгістраваны як* ***інтэрнаты,*** *але па наяўных дакументах статус некаторых з іх ставіцца усё ж пад сумненне. Каб расставіць усе кропкі над «і», аблвыканкам звярнуўся ў Міністэрства ЖКГ па ацэнку сітуацыі. «Звязда» будзе сачыць за яе развіццём.*

■ Камунальныя стасункі

## Жыхары першых паверхаў за ліфт плаціць не будуць

**Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ.**

З першых дзён года ўступіў у сілу ўказ аб новай сістэме аплаты камунальных паслуг. Згодна з ім, цяпер у жыроўках з'явяцца новыя радкі. У прыватнасці, плата за ліфт падзеліцца на дзве часткі, дзе адным пунктам будзе стаяць тэхнічнае абслугоўванне ліфта, а другім — плата за энергію, якую ён спажывае.

Паслугу «тэхнічнае абслугоўванне ліфта» ўладальнікі кватэр будуць аплачваць у адпаведнасці з плошчай іх жылля. Паводле слоў кіраўніка ўпраўлення эканомікі Мінжылкамунгаса Алены Дудзінскай, раней аплата за карыстанне ліфтам бралася згодна з колькасцю зарэгістраваных у кватэры чалавек, а цяпер аплата будзе разлічвацца па тарыфах на 1 квадратны метр жылля. Эканамісты ЖКГ падлічылі, што з кожнага «квадрата» за ліфт трэба будзе заплаціць 617 рублёў.

Спецыяліст патлумачыла, што ў новых дамах людзі нярэдка купляюць кватэры і не рэгіструюцца па месцы жыхарства. Такім чынам, яны не плацяць за ліфт, які неабходна абслугоўваць. Яна падкрэсліла, што ліфт з'яўляецца неад'емнай часткай абсталявання жылога дома, таму плата за яго выкарыстанне павінна разлічвацца, зыходзячы з займанай жылой плошчы. Алена Дудзінская адзначыла, што такая практыка прымяняецца ў Расіі, Германіі і іншых дзяржавах.

А вось плата за электраэнергію, спажытую пры рабоце ліфта ў кожным канкрэтным месяцы, будзе «раскідвацца» паміж жыхарамі дома, якія там зарэгістраваны. Тут вызначаны тарыф — 6,8 тысячы рублёў з чалавека. Аплата будзе праводзіцца па факце ў залежнасці ад колькасці людзей, якія пражываюць.

**КАМЕНТАРЫЙ ДЭПУТАТА**

**Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:**

— Магчымасць унясення змен у заканадаўства прапрацоўваецца: сапраўды, людзі з першых паверхаў амаль не карыстаюцца ліфтам. Пытанне будзе разглядацца ў Саўміне. Напэўна, распрацоўшчыкі ўказа ўлічылі не ўсё.

Першапачаткова гаварылася, што жыхары першых паверхаў не будуць плаціць увогуле. Аднак на «прамой лініі» Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі журналістам паведамілі, што жыхары першых паверхаў павінны будуць плаціць за тэхабслугоўванне ліфта. Справа ў тым, што ліфт — гэта агульнадамавая ўласнасць і яго тэхабслугоўванне ўключае ў сябе пэўныя рэгламентныя работы.

Атрымліваецца, што за тэхнічнае абслугоўванне ліфтоў павінны плаціць усе ўласнікі, незалежна ад таго, карыстаюцца яны гэтай маёмасцю ці не. Такая норма прапісана ў дзейным заканадаўстве.

З такой логікай не згодны жыхары першых паверхаў. Гэта прымусіла больш дасканала разгледзець сітуацыю ў міністэрстве і зрабіць там «работу над памылкамі». Генадзь Аксціловіч паведаміў «Звяздзе», што цяпер рыхтуецца адпаведная пастанова Саўміна, дзе жыхароў першых паверхаў вызваляць ад платы за ліфт. Яны не будуць плаціць ні за тэхабслугоўванне, ні за электрычнасць, якую спажывае ліфт. «Казаць пра тое, што лішніх сум дакладна не будзе ў жыроўках жыхароў першых паверхаў ужо за студзень, пакуль зарана», — удакладніў спецыяліст.

## Сабекошт паслуг істотна паменшаць

**Сёлета затраты на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву плануецца знізіць не менш як на 15%, паведаміў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ на выніковай калегіі ведамства.**

На яго погляд, асноўным параметрам эфектыўнасці, па якім будзе ацэньвацца работа кіраўнікоў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у будучай пяцігодцы аб'яўлены паказчык па зніжэнні выдаткаў. «На 2016 год запланавана знізіць гэтыя выдаткі як мінімум на 15%, а зніжэнне ў наступныя гады складзе 5%», — адзначыў Аляксандр Церахаў. Нядрэнна спрацавала сістэма ЖКГ у мінулым годзе, лічыць міністр, калі выдаткі па галіне ўдалося знізіць на 10,7%. Увогуле летась былі забяспечаны неабходныя аб'ёмы і якасць паслуг, якія аказваліся насельніцтву.

Адным са значных фактараў па зніжэнні выдаткаў на жыллёва-камунальныя паслугі з'яўляецца аптымізацыя колькасці супрацоўнікаў. Летась штат супрацоўнікаў ЖКГ быў зменшаны на 4,5 тысячы чалавек, або на 2,9%. Пры гэтым доля адміністрацыйна-кіраўнічага апарату знізілася з 9,2% да 8,4% ад агульнай колькасці работнікаў арганізацыі. Эканамічны эфект ад падобнай аптымізацыі склаў больш за 500 млрд рублёў. Гэты вынік забяспечаны перш за ўсё за кошт актыўнай працы па ўжыванні прадпрыемствамі перагледжаных нормаў і нарматываў колькасці супрацоўнікаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 3 (303)

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

## УВАГА, АЎТАРЫ!

Да ўдзельнікаў конкурсу апавяданняў «Звязды» ў 2016 годзе

Мы будзем працягваць літаратурнае спаборніцтва і запрашаем да ўдзелу ўсіх, хто піша ці нават чытае апавяданні на старонках газеты — можа быць, прыспеў час выпрабаваць свае магчымасці?

Таму што наш конкурс адкрыты для вас — і для прафесійных літаратараў, і для тых, каго натхненне ці жаданне выказацца падштурхнула да стварэння апавядання. Каму ёсць пра што напісаць ці захацелася падзяліцца сваімі думкамі пра свет, жыццё ў ім чалавека. Ці раптам вы былі сведкамі цікавых падзей, неардынарных сітуацый, пра якія можна распавесці ў літаратурным творы. Ці прыспеў час з чытача ператварыцца ў пісьменніка...

Умовы: разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара (!) памерам да 5 старонак (ці да 10—12 тысяч знакаў). Гэта павінна быць апавяданне на беларускай мове, якое нідзе дагэтуль не друкавалася. Рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Апавяданні накіроўвайце на адрас: **газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, з пазнакай «На літаратурны конкурс»**. Можна дасылаць апавяданні на электронны адрас: **info@zviazda.by** таксама з пазнакай «Літаратурны конкурс».

Шаноўныя аўтары! Абавязкова паведамляйце сваё прозвішча і імя (сапраўднае), імя па бацьку, дакладны паштовы адрас і поўныя пашпартныя звесткі (нумар, кім і калі выдадзены, асабісты нумар), а таксама кантактны тэлефон. Калі ласка, напішыце колькі слоў пра сябе: чым займаецеся, калі і пад уплывам чаго пачалі пісаць.

Вядучым конкурсу ў 2016 годзе застаецца **пісьменнік Алесь БАДАК, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»**.

Найлепшыя апавяданні, пададзеныя на конкурс, будуць надрукаваны на старонках газеты з выплатай ганарару. Грашовыя прэміі атрымліваюць пераможцы пасля падвядзення вынікаў.

## ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ

Адметна, што наш конкурс апошнія гады прыцягвае ўвагу ў асноўным удзельнікаў з пісьменніцкага асяродку ці з кола нашых пастаянных чытачоў. Так было, прынамсі, у 2015 годзе. Вельмі радасна, калі нашы аўтары не губляюцца і нагадваюць пра сябе новымі творамі — тады ёсць адчуванне, што конкурс праводзіцца нездарма, што ў яго ёсць свая чытацкая аўдыторыя.

Дзякуй усім нашым аўтарам, якія не першы год дасылаюць свае апавяданні на конкурс. Дзякуй і тым, хто далучыўся да нас толькі летась, хто пісаў таму, што не мог не пісаць, калі адчуваўся натхненне, калі думкі прасіліся на белы аркуш. Дзякуй нашым аўтарам за тое, што пішуць на беларускай мове (і тым, хто, можа быць, паспрабаваў гэта зрабіць упершыню — ёсць і такія людзі, якіх падштурхнула менавіта наша газета). Дзякуй і тым, хто дасылаў свае творы на конкурс, але апавяданні не былі надрукаваныя. Ёсць фармат газеты: не ўсё, што напісана нават творча і з думкай, можа пабачыць свет у перыядычным выданні. Да таго ж конкурс, які праводзіць нацыянальная газета, якая ідзе на ўсю краіну, мае свае ўмовы, і патрабаванні да якасці тэкстаў ніхто не адмяняў. Па-першае: твор павінен мець думку і адлюстроўваць праз вобразы сучасную беларускую рэчаіснасць, разважаць пра чалавека ў ёй. Па-другое: апавяданне — гэта майстэрства слова, якое павінна адчувацца нават у не вельмі вялікім тэксце.

Вядучы конкурсу 2015 года Алесь Бадак, прадстаўляючы апавяданне і аўтара, звяртаў увагу на вартасці твора і асаблівасці аўтарскай манеры. Сярод нашых пераможцаў за мінулы год — літаратары і аматары літаратуры, якія штодзённа займаюцца іншай працай, але маюць сваё адчуванне і погляд на складаныя з'явы жыцця. Узнагароджанне пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда». Удакладніць інфармацыю можна па кантактным тэлефоне: +375 29 6910249 (Velcom).

**ВІНШУЕМ І ЗАПРАШАЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ:**

**1-я прэмія — Віктар ВАРАНЕЦ, апавяданне «Таямніца Фары Вітаўта» (4 верасня 2015 года).**

**2-я прэмія — Андрэй СІДАРЭЙКА, апавяданне «Велікодны пачастунак» (9 чэрвеня 2015 года).**

**3-я прэмія — Леанід ЛЕВАНОВІЧ, апавяданне «Дзед Васіль і Орлік» (30 красавіка 2015 года).**

# «ГІСТОРЫЯ — ГЭТА ГІСТОРЫІ»

## Час магнатаў у галерэі

**Падарожнічаць можна не толькі ў прасторы, але і ў часе. Пра гэта выдатна ведаюць мастакі і паэты. Ім дадзены талент наблізіць да нас гісторыю. У гэтым пераконвае і выстаўка «Час магнатаў», якая працуе ў галерэі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.**

**Рыцары, магнаты, першадрукі. Цяпер для мяне гэта не проста словы, а жывыя вобразы, якія інтрыгуюць. Пра тое, як гэтага здолелі дабіцца маладыя мастакі, разважае адзін з куратараў праекта, скульптар і выкладчык скульптуры, малюнка і кампазіцыі Гімназіі-каледжа мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка Іван АРЦІМОВІЧ.**

### Пачаць з гісторыі

«Мы падалі заяўку на конкурс культурных ініцыятыў праекта «Голас культуры», які рэалізуецца пра падтрымцы Еўрапейскага саюза. Мэта яго — пагрузіцца і нам, педагогам, і навучэнцам, у гісторыю, у так званы «залаты век» беларускай гісторыі — гэта XV, XVI, XVII стагоддзі. У гэты час былі створаны найбольш вядомыя архітэктурныя ансамблі — Мірскі, Нясвіжскі замкі, жылі Радзівілы, Сапегі, адбываліся шматлікія гераічныя падзеі, інакш кажучы, гэта час, багаты на рэальную гісторыю, таксама на легенды і міфы. Для мастака гэта ўсё неверагодна цікава — па-першае, ужо няма тых людзей, ніхто не ведае іканаграфію, не захавалася фотаздымкаў, ёсць шырокая пляцоўка для фантазіі. Рабі, што хочаш, укладай свой сэнс, ілюструй, ствары алегорыі».

«Час магнатаў» — гэта не проста праект, а культурная ініцыятыва. Як тлумачыць Іван Арцімовіч, гэта «голас культуры, тое, што дапаможа прасоўваць наша мастацтва, прапагандаваць беларускае, падняць нацыянальную гісторыю, тыя факты культуры, на якія мы ўжо забыліся». Кожны твор праекта — самастойны. Яны дзесьці наіўныя, дзесьці дзіцячыя, у той жа час і сур'ёзныя, а іх вартасць у тым, што «кожны з мастакоў укладаў у беларускую гісторыю свой сэнс — гэта шчырае яе прачытанне. Мы можам убачыць гісторыю ў развіцці, не толькі часавым, але і развіцці кожнага з мастакоў».

Выстава «Час магнатаў» атрымалася рознай — дыяпазон шырокі, працы цікавыя. Іван Арцімовіч тлумачыць: «Па-першае, разам з працамі мастакоў-пачаткоўцаў, яшчэ дзяцей, экспануюцца прафесійныя работы; па-другое, праект прадстаўляе нашу навучальную ўстанову, якая з'яўляецца ў Беларусі ўнікальнай — напрыклад, з 5 класа мы вучым дзяцей скульптуры, можна ўбачыць творчасць кожнага ў развіцці». Акрамя таго сама тэма знакавая для культуры Беларусі, для людзей, якія цікавяцца культурным працэсам, якія з'яўляюцца часткай культурнай і гістарычнай супольнасці. Кожная праца тут мае сваю аўтарскую інтэрпрэтацыю — з аднаго боку, гэта нешта асабістае, інтымнае, з другога — гэта адсылка да нашай гісторыі, і чым часцей мы будзем гэтую тэму закранаць, тым больш яна будзе ўплываць на тое, што адбываецца сёння. Калі мы вяртаемся да гісторыі зноў і зноў, гэта значыць, што яна жыве — жывуць тыя ж праблемы, тыя ж паняцці, тыя ж ідэі».

### Адчуць гісторыю

Выкладчык і мастацтвазнаўца Галіна Багданава адзначыла, што на занятках па гісторыі мастацтва можна паказваць працы з праекта як ілюстрацыі да гістарычных падзей: «Кажуць, што народ без памяці дрэнны. Я думаю, шмат можна знайсці прымавак пра гісторыю, а гэта народная мудрасць не на пустым месцы ўзнікла. Простыя людзі ведалі, што гаварылі, разумелі і стараліся берагчы свой род і традыцыі сваіх продкаў, бо чалавек жа не ўзяўся ніадкуль, не выткаўся з паветра. За кожным чалавекам — пакаленні».

Іван Арцімовіч кажа, што для яго адказ на пытанне пра важнасць гісторыі — відавочны: «Канешне, гэта моцна залежыць ад чалавека, які накіроўвае. Але для мяне, напрыклад, гісторыя — гэта гісторыі. Гісторыя цікавая, бо гэта не проста сухія лічбы, пералік прозвішчаў, але і сюжэты, жывыя людзі, іх узаемаадносіны. Гісторыя — гэта прадмет фантазіі: ад казкі да гісторыі, ад легенды да прыпавесці. Канешне, той пласт гісторыі, які падняты ў нашым праекце, — гэта ўзрушаная фантазія. Дзяўчаты тут знойдуць прыгожыя жаночыя ўборы, а хлопцы — гераічнае мінулае».



Наталля ШЫБКО. «Легенда аб камянях».

Новае, сучаснае — гэта асэнсаванне і трансфармацыя ўжо перажытага. Праз мінулае можна вырашаць праблемы сучаснасці, лічыць Іван Арцімовіч: «Калі звярнуцца да маіх дзіцячых успамінаў і ўяўленняў, а ў дзяцінстве закладаецца аснова ўсяго, то мой бацька на гісторыі, як крыніцы бязмежных магчымасцяў для мастака, перадаў і мне любоў і цікаўнасць да гэтай тэмы. Для мяне гэта багаты пласт бясконцасці вобразаў, у якім можна знайсці творчыя ідэі і рашэнні... Сваім зваротам да гісторыі маладыя мастакі нясуць яшчэ сваю будучыню, нашу будучыню як народа. Бо такі элемент як самасвядомасць застаецца важным, нягледзячы на тое, што мы амаль 25 гадоў незалежная дзяржава, але гэты момант кожны асэнсоўвае для сябе сам».

### Намаляваць гісторыю

Сёння мастацтва можа размаўляць з гледачамі з дапамогай не толькі вобраза, але і ідэі. Каб адчуць гэта, можна паглядзець на адну з прац выставы — «4 кароны». Мастакі паказалі карону як сімвал улады. Вытанчаная, жаноцкая — каб падкрэсліць прыгажосць жанчыны; карона з паперы паказвае, што ўлада ператвараецца ў нішто, яна хуткаплынная; са свечак — сімвал таямніцы, змоў, бо ў тыя часы свечкі былі ледзьве не адзінымі сведкамі гістарычных падзей; карона з металу — жорсткая, сімвал грахоўнасці ўлады: «Гэта ўсё філасофскія рэчы. Пры дапамозе адзінага вобраза па індывідуальным рашэнні тут паказаны шэраг адмысловых асацыяцый, але гэта ўвогуле рыса сучаснага мастацтва — некаторыя рэчы трэба растлумачваць гледачу. Мова мастацтва не змянілася — яно, як і 300 гадоў таму, вымаўляе тымі ж сродкамі: жывапіс — колерам, малюнкам, скульптура — формай і прасторай вакол... Мова не змянілася — змяніўся светапогляд і адносіны мастака да свайго выказвання. Яно становіцца больш змястоўным, больш арыентаваным не на канстатацыю факта, а на яго філасофскі змест, на сімвалы і знакі. Калі твор становіцца знакам — гэта найвышэйшая яго форма».

Іван Арцімовіч сам шмат увагі надае гісторыі — напрыклад, ён з бацькам і скульптарам Уладзімірам Церабуном ужо амаль 10 гадоў працуе над маштабным праектам, які прысвечаны Першай сусветнай вайне — гэта комплекс па лініі супрацьстаяння ў Смаргоні ў 1915—1917 гадах, калі там праходзіла лінія фронту. У той час горад быў практычна знішчаны, а пра гэтыя падзеі амаль ніхто не ведае: «Там адбываліся неверагодныя рэчы — упершыню на тэрыторыі Беларусі ўжылі газавую зброю, упершыню там узляцеў і разбіўся паветраны карабель «Ілля Мурамец», упершыню там дзейнічаў жаночы батальён Марыі Бачкаровай». Комплекс вялікі — будуць не толькі скульптурныя кампазіцыі. Праект стане інтэрнацыянальным.

### Быць гісторыяй

Іван Арцімовіч працуе не толькі з манументальнай скульптурай, але і з малымі формамі. З чым працаваць лягчэй — ён не кажа, бо «ўсё вялікае робіцца з малога. У малым усё вырашаецца — і вобраз, і кампазіцыя, і ідэя. Усе складнікі вялікага твора адразу вырашаюцца ў невялікім памеры. Манументальная скульптура — гэта як стварэнне фільма — праца не аднаго чалавека. У скульптуры аўтар, канешне, пануе, але ён робіць твор не адзін».



Навучэнцы 3 курса Максім ЕРМАКОВІЧ і Ян ЛЕЎША са скульптурнай кампазіцыяй апошняга «Астафій Багданавіч Валовіч».

Удзельнік і арганізатар мастацкіх выстаў у Беларусі і за мяжой, аўтар кнігі пра беларускую школу скульптуры, Іван Арцімовіч усё яшчэ хвалюецца, калі прадстаўляе працу аўдыторыі: тады прыходзіць момант чакання і крыху расчаравання — як гэта будзе ўспрынята: «У галерэі праца ўжо перастае быць тваёй — яна належыць людзям». Ён — сам яшчэ малады скульптар, таму парады маладым даваць не збіраецца. Адзінае, што можа параіць, — любіць сваю прафесію, людзей навокал, сваю гісторыю. І несці мастацтва ў масы, магчыма, нават сілком, пачынаючы з папулярных форм, але галоўнае — «хоць крышачку пахіснуць наш нерухомы свет». Праект «Час магнатаў» якраз дэманструе рухомасць і зменлівасць.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР.

■ Кінакрокі

# НА ЧЫІХ ПЛЯЧАХ ТРЫМАЕЦЦА ЗДЫМАЧНЫ ПРАЦЭС?

## Чарговая ноч, адданая назіранню за стварэннем фільма

**Працэс распачаты, камеры працуюць, рэжысёры кажуць «матор!»: сцэнарыі, што перамаглі ў двух конкурсах кінапраектаў мінулага года, перакладаюцца (а некаторыя ўжо перакладзены) на мову кіно. Работа над карцінай «Трымайся за аблокі» пра брыгаду лэпаўцаў, гэта значыць тых, хто працуе на лініях электраперадач, у разгары. Героямі васьмісерыйнага фільма з'яўляюцца «звычайныя» людзі, якія, канешне ж, па-свойму незвычайныя. Аднойчы мы ўжо паўдзельнічалі ў стварэнні навагодняй серыі (чытайце рэпартаж «Здымачная ноч» ад 9 студзеня) і, нягледзячы на тое, што няслаба тады заледзянелі, вырашылі вярнуцца на начную здымачную пляцоўку і расказаць у другім рэпартажы пра тое, што не паспелі ахапіць у мінулы раз.**


Акцёры масавых сцэн слухаюць «інструкцыю». У VIP-зале аэрапорта.

Хочацца паказаць тых членаў групы, удзел якіх аказваецца не такім відавочным, як твары выканаўцаў галоўных роляў (гэта беларускія і расійскія акцёры). Такая канцэпцыя сугучная з прынцыпам самога фільма: у цэнтры ўвагі аказваюцца людзі, праца якіх застаецца для нас незаўважнай, але ў той жа час надзвычай каштоўнай. Акцёраў тым не менш згадаем: у серыяле «Трымайся за аблокі» сыграюць Сяргей Юшкевіч, Аляксандр Ільін, Кірыл Навіцкі, Максім Крэчатаў, Андрэй Сенькін, Андрэй Кочынаў, Пётр Рыкаў ды іншыя.

**Для адной серыі фільма патрэбна каля дзесяці пляцовак у памяшканні і каля пятнаццаці натурных — потым яны могуць фігураваць у іншых эпізодах, таму агулам у васьмі эпізодах «засвеціцца» каля пятнаццаці інтэр'ераў і сарака «натур».**

Мінулы раз падчас здымак фільма на Кастрычніцкай плошчы на маё пытанне аб пасадзе пэўнага члена каманды мне адказалі: «Самы галоўны чалавек на пляцоўцы... **рабочы**». Ён жа баец, ён жа спецыяліст па няясных пытаннях, ён жа працоўны адміністрацыі здымачнай групы, ён жа грузчык («ён жа Гоша, ён жа Гога...»). Чалавек, які працуе, нават калі проста стаіць, бо сочыць, напрыклад, за тым, каб выпадковы мінак не апынуўся ў полі зроку кінакамеры, не перашкодзіў здымкам гучным воклічам.

У ноч з 14 на 15 студзеня мы з фатографам паспелі наведаць адразу дзве пляцоўкі, на якіх працягвалася праца над восьмай, навагодняй, серыяй. Пэўныя сцэны здымаліся ў VIP-зале Нацыянальнага аэрапорта і тут жа, на ўзлётнай паласе, паралельна ішоў працэс на тэрыторыі Мінскага завода шасцерняў, дзе знаходзіцца апора ЛЭП.

Па сцэнарыі прыродныя катаклізмы напярэдадні Новага года пашкодзілі электрычныя лініі, што вызвала перабоі са святлом, парушыла графік руху транспарту і стала пагражаць паўнавартаснаму святкаванню Новага года. Члены брыгады лэпаўцаў, якія таксама рыхтаваліся да вечара і вырашалі пытанні асабістага жыцця, вымушаны былі выйсці на працу, каб выратаваць свята — знайсці месца аварыі і адрамантаваць лініі электраперадач...


Ідзе праца над сцэнай. Мароз.

Фота Надзеі БУЖАН.

На кожнай здымачнай пляцоўцы знаходзілася па два «байцы». Аляксандру Балбукову выпала ў гэтую ноч працаваць на марозе, але дыскамфорту ён, здаецца, не адчуваў і казаў, што нават не ходзіць грэцца ў вагончыкі. Галоўным прадметам сваёй адказнасці Аляксандр назваў парадак і запэўніў, што пасля яго тэрыторыі застаюцца чыстымі. Але гэта не ўсё — акрамя іншага, рабочы ставіць палатку з плэйбэкам (праглядальным маніторам для рэжысёра), удзельнічае ва ўстаноўцы апаратуры, арганізуе харчаванне і гарачыя напоі, дапамагае кожнаму члену групы, які мае ў гэтым патрэбу. Мы з ім размаўлялі за варотамі — з другога боку ад работы над


Невялічкая сцэна з эпізадычнай роляй сцюардэсы, а працуе дзеля яе цэлы штат кіношнікаў.

сцэнай фільма, Аляксандр у гэты момант ахоўваў уваход — стаячая работа на практыцы. Цішыня. Размаўляць можна толькі шэптам.

Месцы здымак паміж сабой кантраставалі: светлае памяшканне залы, пустэча ўзлётнай паласы, заснежаная змрочнасць сярод пабудоў завода... Праца тут патрабуе віртуознасці **асвятляльнікаў** і іх кіраўніка — так званага **гафера** (на праекце гэта Аляксандр Івашкоў).

Для кожнай пляцоўкі трэба каля пяці спецыялістаў і не менш за пяць тон тэхнікі, у лік якой уваходзяць, напрыклад, кінафло (асвятляльны прыбор з люмінесцэнтнымі лямпамі), рамы, што рассейваюць святло, інтэнсіўны асвятляльнік «1200», адбівальнікі, кабелі і так далей. Нямала важыць штатыў, які можа дасягаць шасці метраў у вышыню. А калі яго параметраў не хапае, выкарыстоўваецца скайліфт, які ўжо можа падняцца на шаснаццаць метраў (але і важыць адпаведна больш).

**Прафесія асвятляльніка захоўвае баланс паміж фізічнай і разумовай працай. Ён ідэальны: «пяцьдзесят на пяцьдзесят», як кажа Аляксей.**

З дапамогай неверагоднай колькасці прыстасаванняў забяспечваецца патрэбнае для паэтыкі фільма асвятленне, выраўноўваецца колер твару акцёраў, прыбіраюцца непажаданыя адлюстраванні (напрыклад, у акне) альбо блакіруюцца крыніцы святла (манітор ці экран). Ва ўсіх нюансах разбіраецца Аляксей Шахаў, што ўдзельнічае ў праекце «Трымайся за аблокі» з самага пачатку. Ён кажа, што з дапамогай асвятлення можна стварыць як прыгажуню, так і пачвару. Ад яго ж я даведалася, што спецыялістаў гэтага кірунку не рыхтуюць у вышэйшых навучальных установах, але школай можа стаць, напрыклад, пасада памочніка аператара.

Праца асвятляльніка пачынаецца задоўга да пачатку здымачнага дня: тэхніка патрабуе рэгулярнай праверкі, а гэта пытанне бяспекі на пляцоўцы, бо нават нязначная няспраўнасць можа прывесці да трагедыі. Кожная адзінка абсталявання, кожны метр кабеля штогод праходзяць спецыяльную камісію, каб атрымаць штамп прыгоднасці да працы, але, акрамя гэтага, каманда правярае свой рэквізіт перад кожным здымачным днём. Прафесія асвятляльніка захоўвае баланс паміж фізічнай і разумовай працай. Ён ідэальны: «пяцьдзесят на пяцьдзесят», як кажа Аляксей.

У сваю чаргу, творчых пошукаў і ўвагі да высокіх матэрый патрабуе пасада **мастака-пастаноўшчыка**. Кожная здымачная пляцоўка, яе «выгляд», антураж, рэквізіт, касцюмы знаходзяцца ў яго распараджэнні. Вялікія прамежкі паміж перыядамі здымак серыяла вымусілі Андрэя Тоўсціка, мастака-пастаноўшчыка праекта, адмовіцца ад ідэі пабудовы дэкарацый, бо іх захоўванне (у разабраным выглядзе) дорага каштавала б. Таму мастак з дапамогай лакейшн-менеджара шукае рэальныя інтэр'еры і месцы для здымак на натуры. Для адной серыі фільма трэба каля дзесяці пляцовак у памяшканні і каля пятнаццаці натурных — потым яны могуць фігураваць у іншых эпізодах, таму агулам у васьмі эпізодах «засвеціцца» каля пятнаццаці інтэр'ераў і сарака «натур». Адзін інтэр'ер будзе пабудаваны — «вагончык» брыгады лэпаўцаў (а ён аснашчаны спальнымі месцамі, кухняй, захоўвае патрэбныя для працы інструменты і ўвогуле прыдатны да жыцця), які для зручнасці будзе зроблены крыху большым за рэальны і да таго ж — з адстаўнымі сценамі для варыяцый ракурсаў кінакамеры.

Знойдзеныя месцы здымак мастак-пастаноўшчык адаптуе пад сцэнарый ці якасці героя, робячы дадэкарацыю. Тут, апроч іншага, улічваюцца нюансы кінапрацэсу. «Трэба глядзець на месца здымак вачамі аператара. Напрыклад, лепш пазбягаць белых памяшканняў: там складана здымаць. Бліскучыя паверхні павінны быць ідэальна роўнымі, у іншым выпадку пажадана іх замаціраваць, апрацаваць антыблікам», — расказвае Андрэй Тоўсцік.

**Месцы здымак паміж сабой кантраставалі: светлае памяшканне залы, пустэча ўзлётнай паласы, заснежаная змрочнасць сярод пабудоў завода... Праца тут патрабуе віртуознасці асвятляльнікаў і іх кіраўніка — так званага гафера.**

Частка эпізодаў карціны «Трымайся за аблокі» здымаецца ў рэальных памяшканнях, напрыклад, у Міністэрстве энергетыкі альбо ў дыспетчарскай аэрапорта. Серыі, дзеянне ў якіх адбываецца ў Расіі, будуць ствараецца ў Беларусі — дастаткова памяняць сімволіку, шыльды і нумары на аўтамабілях.

У пэўным сэнсе здымкі гэтага серыяла — цікавы пасаж, бо апошняя серыя ўжо ствараецца, а папярэднія эпізоды толькі чакаюць сваёй чаргі. Так ці інакш, чым усё скончыцца, пакуль ведае толькі здымачная група. Таму інтрыга, як ужо казалася, захоўваецца да лета 2017 года, калі серыял будзе паказаны на тэлеканалах Беларусі, Украіны, Расіі і Казахстана.

Здымачная ноч гэтым разам зноў доўжылася да сямі раніцы, дублі памнажаліся, эпізоды ўпісваліся ў хронаметраж будучай карціны. Калі прыйшлося чарговы раз змерзнуць на пляцоўцы, уявіла сабе, як здымалася «Легенда Х'ю Гласа» з Леанарда ДзіКапрыа (якая сёлета атрымала тры ўзнагароды «Залаты глобус»), і вырашыла, што Оскар фільма не варты. Можа, ён акажацца не вартым і карціны «Трымайся за аблокі»?

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

***Больш фотаздымкаў шукайце на сайце zviazda.by***

# Міхась МІЦКЕВІЧ:

# «ШЧАСЦЕ — КАЛІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА МАРЫ...»

*Колькі гадоў таму я сустрэў супрацоўніка Коласаўскага музея Івана Курбеку. Ён трымаў у руках «Анталогію беларускай эпіграмы», паказаўшы кнігу, параіў мне абавязкова яе набыць.*

*— Там выдатныя эпіграмы Міхася Міцкевіча! — горача даводзіў ён. — Таленавіта, дасціпна. Абавязкова пачытай!*

*Прачытаўшы, пераканаўся: у эмацыянальнай ацэнцы Курбекі не было ні кроплі перабольшання. Сапраўды, эпіграмы Міхася Міцкевіча, малодшага сына Якуба Коласа, вылучаліся нават сярод твораў паэтаў-прафесіяналаў. А між тым іх аўтар — не пісьменнік і прадмет яго прафесійнага інтарэсу зусім не літаратура. Міхась Канстанцінавіч — тэхнар, доктар тэхнічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за распрацоўкі ў галіне тэхналогі і абсталявання для электраэразійнай апрацоўкі металаў. Аўтар больш чым дваццаці вынаходніцтваў. А яшчэ ён — майстар спорту СССР па стэндавай стральбе. А яшчэ — старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Ірландыя». А яшчэ — ганаровы грамадзянін Мар'інай Горкі...*

*Але не буду пералічваць усё, чым заняты і сёння, у свае шаноўныя гады, гэты нястомны, няўрымслівы чалавек. Адно скажу: вольнага часу ў яго не многа.*

*Пасля знаёмства завочнага неўзабаве адбылося і непасрэднае знаёмства з Міхасём Канстанцінавічам. Вось ужо сапраўды: калі нечага вельмі хочаш, яно абавязкова збудзецца. Быццам пачуўшы мае думкі-мары, пазваніў Мікола Мятліцкі, тагачасны галоўны рэдактар часопіса «Полымя», і запытаўся, ці не хацеў бы я паехаць на Пухавіччыну разам з сынам Якуба Коласа. Канешне ж, хацеў бы! Хоць зараз.*

*І вось гарачым жнівеньскім днём мы выбраліся ў вандроўку па тых мясцінах, дзе ў даваенныя гады летавала сям'я Коласа, дзе прайшло маленства і пачатак юнацтва Міхася Канстанцінавіча. Ужо самі назвы тутэйшых мясцін гучаць чароўна-загадкава, паэтычна — Талька, Загібелька, Падбярэжжа, Вусце, Беразянка, Балачанка...*

*Вядома, многае тут за мінулыя дзесяцігоддзі непазнавальна змянілася. Дзе было поле — вырас гонкі, густы сасоннік. На месцы колішняга пляжа з бялюткім пясочкам — у пояс дзікая, даўно не кошаная трава. Парадзела на стромым беразе Свіслачы дубовая града. Няма і самой вёскі Беразянка, якая так падабалася Коласу і ў якой ён збіраўся нават будаваць сваё лецішча. Вёску ў гады вайны за сувязь з партызанамі фашысцкія карнікі знішчылі датла.*

*Змянілася многае, аднак Міхась Канстанцінавіч на дзіва лёгка арыентуецца на мясцовасці. Паказвае месца, дзе стаяў хутар Андрэя Асіеўскага, у якога Колас летаваў некалькі гадоў запар, беспамылкова знаходзіць знакаміты вусцянскі груд, на якім колісь любіла збіраць белыя гваздзікі Марыя Дзмітрыеўна. А пасля ледзь прыкметнаю сцежкаю праз амаль непралазны гушчар кіруемся туды, дзе мелкаводная Балачанка ўпадае ў шырокую і быструю Свіслач. Прыгажосць — вачэй не адвесці!*

*— А можаце сабе ўявіць, — узрушана кажа Міхась Канстанцінавіч, — як тут было хораша ў тыя гады. Месца не толькі маляўнічае, але і рыбнае. Сюды з вудамі нярэдка завітваў Колас, амаль штодня прыбягаў я з сябрамі.*

*На хвіліну позірк Міхася Канстанцінавіча задумліва туманіцца — ён нібы ўзіраецца скрозь гады ў сваю далёкую памяць. Але толькі на хвіліну, бо ўжо ў наступны момант Міхась Канстанцінавіч прапаноўвае нам завітаць яшчэ ў вёску Балачанка, дзе пасля вайны колькі летаў Колас спыняўся ў хаце старшыні мясцовага калгаса Канстанціна Дзяткі...*

*Дзівімся нястомнасці, рухавай энергіі гэтага немаладога ўжо чалавека. Ён нібыта забыў пра свае хворыя ногі, пра сваё кволае сэрца — тупае і тупае, без перадыху, без супынку. Гэтая зямля, што вяртае яго да вытокаў, здаецца дае яму і сіл, і бадзёрасць, і натхненне. Міхась Канстанцінавіч увесь час успамінае цікавыя эпізоды з таго даўняга летавання, пацешныя здарэнні, крანальныя дэталі... Зайздросная памяць! У свае шаноўныя гады ён без усялякага намагання прыгадвае дзясяткі розных датаў, назваў, прозвішчаў.*

*Яблыка ад яблыні далёка не падае. Гэтая народная прымаўка ў самым не лепшым сэнсе міжволі прыгадваецца, калі глядзім на Міхася Канстанцінавіча. Як жа ён падобны на свайго бацьку! Гэткая ж дужая, каржакаватая постаць, высокі сакратаўскі лоб, удумлівыя, нярэдка з гарэзлівымі іскрынкамі вочы. Падобны не толькі воблікам, але і характарам — такі ж, як і Колас, спакойны, пасялянску разважлівы, мудры і сціплы, добразычлівы.*

*І захацелася дазнацца пра гэтага цікавага, таленавітага чалавека крыху шырэй, пагаварыць з ім сам-насам, няспешліва і, ужо як добра знаёмыя, адкрыта і даверліва.*

*Сустрэліся мы ў Коласаўскім музеі.*



Фота Кастуся ДРОБАВА.

## ДОМ, У ЯКІМ ЖЫВЕ ДУХ ТВОРЧАСЦІ

***— Міхась Канстанцінавіч, а што для Вас у гэтым музеі самае дарагое?***

— Бацькаў кабінет! Тут усё захавалася так, як было пры ім. Тая ж канапа, тыя ж крэслы, той жа пісьмовы стол, на якім стаіць звычайная чарнільніца з чорнымі чарніламі (Колас любіў пісаць толькі такімі), простая ручка з пяром (абавязкова!) № 86. Тут жа ляжаць папкі з рукапісамі, шматлікія блакноты, запісныя кніжкі. Пры боку — старэнькі, пацёрты партфель.

Наведвальнікі звычайна здзіўляюцца: няўжо знакаміты пісьменнік не меў магчымасці купіць сабе новы? Мог, канешне. Але ён быў чалавекам ашчадным, сялянскай закваскі, і лішняга рубля без пільнай патрэбы не траціў. Нават нам, яго сынам, проста так грошай не даваў. Мы павінны былі абавязкова сказаць на што іх патрацім.

А з другога боку, Колас адгукаўся на просьбы дзесяткаў, соцень незнаёмых людзей, якія пісалі яму з розных куткоў рэспублікі. І калі адчуваў, што ў чалавека сапраўды пільная патрэба — скажам, згарэла хата, падохла скаціна, няма чым заплаціць падаткі — пасылаў грашовыя пераводы на даволі значныя сумы. У кабінеце стаіць саламяная шкатулка, у якую бацька складваў цэтлікі ад гэтых пераводаў. Не ўсе яны, вядома, захаваліся, але нават тое, што сабрана, уражвае агульнай лічбай — недзе за сто тысяч рублёў.

Памагаў Колас і сваім калегам. У час вайны, калі мы жылі ў Ташкенце, прыйшло пісьмо з Алма-Аты ад Янкі Маўра — работы няма, пенсіі не атрымлівае, няма чым заплаціць за навучанне ў школе дачкі Наташы. Бацька адразу ж паслаў яму дзвесце рублёў.

Яшчэ раней, у дваццатыя гады, нехта расказаў Коласу, што ёсць малады, таленавіты скульптар, якому з-за безграшоўя вельмі цяжка вучыцца. Бацька пазнаёміўся з хлопцам, паверыў у ягоны талент і ўсе гады, пакуль той вучыўся, выплачваў яму, як ён жартаваў, «пэнсію» са свайёй кішэні. Цяпер імя гэтага скульптара шырока вядома — Заір Азгур.

Ці такі паказальны факт. Нягледзячы на складанае матэрыяльнае становішча ў дваццатыя гады, увесь ганарар за паэму «Сымон-музыка» бацька перадаў аднаму з дзіцячых дамоў. Не ўсе з блізкіх правільна зразумелі гэты гуманны жэст. У бацькі аднак была свая рацыя. Паколькі паэма прысвечана беларускай моладзі, то ён лічыў сваім святым абавязкам аказваць ёй не толькі духоўную, маральную, але і матэрыяльную падтрымку.

***— А гэтыя дзверы з кабінета куды вядуць?***

— У спальню. Бацька любіў тут, натомлены за сталом, на якую гадзінку прылегчы, адпачыць. Тут жа ляжаў ён і калі хварэў. А мы падымаліся сюды, адведвалі яго, і гэта была дарагія для нас хвіліны, бо ў звычайныя дні ў бацькі бракавала часу нават пагаварыць з намі — ён вельмі шмат працаваў.

***— У спальні таксама нічога не пераробляй?***

— Не, усё як было пры бацьку.

***— А дзе ж скрыпачка, якая вісела на дыванку каля ложка?***

— Дык то ж было яшчэ ў старым, даваенным доме, які згарэў.

***— А скрыпка?***

— І скрыпка згарэла.

***— А тая, што мы бачылі на першым паверсе?***

— То скрыпка Янкі Маўра. Яна крыху большая і гук у ёй рэзкаваты, а ў бацькавай быў цудоўны! Сваю скрыпку бацька любіў, іграў, праўда, не часта, але ахвотна.

***— Няўжо гэта ўменне засталося з семінарыі?***

— Так, з семінарыі. Там навучалі ўсяму дастаткова сур'ёзна. Акрамя таго ў бацькі з дзяцінства была любоў да музыкі, добры музыкальны слых, таму гэтая навука яму далася лёгка. Праўда, сказаць, што ён быў адмысловым скрыпачом, не магу, але простыя, немудрагелістыя мелодыі выконваў добра.

***— Напэўна, госці не раз прасілі бацьку сыграць ім што-небудзь...***

— Прасіць, можа, і прасілі, але ён пры чужых людзях гэтага не рабіў. Ва ўсякім разе, я не памятаю. Больш іграў для сябе, а калі выпадаў адпаведны настрой, то і для нас, сямейнікаў.

***— Міхась Канстанцінавіч, а гэта ўсё было яшчэ ў тым, старым доме ці ўжо ў новым?***

— У тым, у тым... Ён стаяў на Вайсковым завулку, каля парка імя Горкага. Дом быў драўляны, двухпавярховы. Месца хапала ўсім. Жылі дружна, ніколі ніякіх непаразуменняў не было.

Пасля вызвалення Беларусі Коласу выдзелілі новы дом, вось тут, каля Акадэміі навук. Дом быў таксама драўляны, двухпавярховы. Праўда, невялікі. Самы вялікі пакой меў квадратаў дванаццаць. Другі, паралельны, такі ж самы, але вузейшы. Трэці пакой яшчэ меншы, затое самы цёплы. Ну і маленькая куханька... Дзіву можна даўца, як мы тут усе месціліся.

З пераездам бацькі ў Мінск пачалося асваенне і добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол хаты. Пасадзілі бярозку і чатыры дубкі, некалькі пладовых дрэўцаў, дэкаратыўных кустоў. Каля хаты зрабілі невялічкі загон, і бацька пасеяў жыта, некалькі гадоў запар праводзіў тут свае доследы. Я не вялікі знаўца сельскай гаспадаркі, але ведаю, што пра выніку гэтых доследаў пісала нават саюзная прэса. Шкада, што да шырокай практыкі справа так і не дайшла.

***— А калі ж быў пабудаваны вось гэты, мураваны дом, які ўласна і стаў музеем?***

— Значна пазней. Набліжаліся семідзесятыя ўгодкі паэта, і ўрад рэспублікі прыняў пастанову пабудаваць яму новы, прыстойны дом. Праект гэтага дома зрабіў вядомы архітэктар Заборскі, а яго рэалізацыю даручылі прафесіянальным будаўнікам. Старую ж драўляную хату знеслі.

Канешне, усе мы вельмі радаваліся новаму жыллю — прыбавілася не толькі прастору, але і зручнасцяў. Па новай двухмаршавай лесвіцы бацьку было падымацца значна лягчэй. Больш утульным, прасторным стаў кабінет. Колас, акрылены гэтым клопатам дзяржавы, меў вялікія творчыя планы. На жаль, жыць яму заставалася нядоўга...

Пасля смерці паэта паўстала пытанне аб стварэнні музея. Было два меркаванні: першае — пабудаваць для музея спецыяльнае памяшканне, дзе былі б створаны ўсе неабходныя ўмовы; і другое — пакінуць усё як ёсць, надаўшы музею статус мемарыяльнага. Перамагло, як бачыце, другое меркаванне. І можа, яно да лепшага. Усё ж такі гэта дом Коласа, тут нябачна вітае яго вобраз, жыве дух высокай паэзіі, дух творчасці.

## ПАЭТ ПАВІНЕН МЕЦЬ СПАГАДЛІВАЕ СЭРЦА

***— Давайце крыху пагаворым непасрэдна пра творчасць Коласа. Якія з яго твораў самы значны і самы дарагі для Вас?***

— Ведаеце, наконт значнасці мне адказаць цяжкавата. Я ж тэхнік. Філалагічнай адукацыі не маю. І мне цяжэй асэнсоўваць усё багацце коласавых твораў. А вось твор, да якога я найбольш прыхільны, які найлепш кладзецца на душу, — дык гэта, безумоўна, «Сымон-музыка».

Праўда, у маладыя гады ў мяне быў крыху іншы погляд — я больш захапляўся «Новай зямлёй». Чаму? Таму што ў гэтай паэме шмат блізкіх, знаёмых мне людзей. Дзеянне адбываецца ў родных наднёманскіх мясцінах. І ўсё гэта апісана ярка, маляўніча, з добрым народным гумарам. Дарэчы, менавіта раздзелы, насычаныя гумарам, гарнулі да сябе больш за ўсё. Пазней — філасофскія роздумы аб зямлі і дарогах, жыцці і смерці.

Трэба сказаць, што незвычайная папулярнасць «Новай зямлі» сярод чытачоў сталася для самога аўтара пэўнай неспадзяванасцю. З бацькавых пісьмаў вынікае, што ён спярша недаацаніў значэння сваёй паэмы. Яму здавалася, што ён проста расказаў пра гаротны лёс адной сям'і. Аказалася, што гэткі ж лёс напаткаў многія беларускія сем'і, што пачуцці і думкі герояў паэмы блізкія тысячам і тысячам чытачоў. Гэта стала своеасаблівай энцыклапедыяй сялянскага жыцця на мяжы стагоддзяў. І кожнага, хто выйшаў з вясковага асяродку, твор не мог не зачароўваць сваёй праўдзівасцю, даступнасцю, паэтызацыяй жыцця простага чалавека, чалавека-працаўніка.

І ўсё ж, як мне здаецца, і для самога Коласа самым дарагім, самым запаветным творам была паэма «Сымон-музыка».

***— А Вы пры жыцці бацькі ўсё чыталі, што ён пісаў, выдаваў?***

— Не, не ўсё. Былі ж нейкія свае неадкладныя клопаты. А пасля, калі гаварыць шчыра, не было яшчэ глыбокага разумення значнасці, класічнасці стваранага Коласам. Для мяне ён найперш заставаўся бацькам. Гэта ўжо пазней, перачытваючы і тую ж «Новую зямлю», і таго ж «Сымона-музыку», я спазнаў сапраўдны смак ад філасофскіх раздзелаў паэм, ад шматлікіх адступленняў аўтара, у якіх закранаюцца актуальныя праблемы сучаснасці, глыбінныя пытанні чалавечага жыцця наогул.

***— Міхась Канстанцінавіч, а самі Вы часта звяртаецеся да твораў Коласа?***

— Ну, не скажу, каб ужо вельмі часта, але і нярэдка. Звычайна, калі ўзнікае нейкая патрэба. Прычым такая патрэба ў апошнія гады ўзнікае значна часцей, чым раней. Ведаеце, у юнацкія гады з бацькавых твораў я быў зачараваны зусім не паэмамі, а ягонымі палескімі аповесцямі. Павольнае і бясхітраснае развіццё падзей, цудоўная мова, незвычайная цеплыня і смутак маладога настаўніка ў дачыненні да сваёй каханай прымушалі па-сапраўднаму перажываць разам з ім.

Чытаючы гэтыя аповесці, я тады нават не здагадваўся, што за іх персанажамі стаяць рэальныя асобы. І быў вельмі здзіўлены, калі неўзабаве пасля вайны прыйшоў ліст ад Габрынькі з-пад Пінска. Яна пісала крыху пра сябе і пра тое, што сястра яе

Ядвіся жыве ў Польшчы, замужам за афіцэрам. Значыць, і іх бацька, пан падлоўчы, таксама рэальная асоба? Каму ж тады належыць яго маналог, які так моцна ўразіў мяне — маналог аб нашых продках-літвінах, яму ці аўтару? У той гісторыі, якую мы вывучалі ў школе, ні слова аб гэтым не было. Толькі значна пазней, вывучаючы карту Беларусі, я заўважыў мноства вёсак з назвамі, утворанымі ад слова Літва: Літвінка, Літвяны, Літвічы...

Несумненна, Колас пісаў з настальгіяй у сэрцы аб сваіх маладых гадах, аб перажываннях першага кахання. Пазней, у ваенныя гады, гэтую аповесць давялося перачытаць і яму. І ён адзначыў: чытаў да позняй ночы як дзённік сваёй маладосці.

Ён выношваў думку напісаць яшчэ пра свае юнацкія гады семінарскіх часоў, нашаніўскага перыяду. Гэта было б своеасаблівае мастацкае даследаванне руху маладых людзей да навукі, да літаратуры, да новага жыцця. На жаль, рэалізаваць гэтую задуму бацьку ўжо не хапіла часу...

***— Я недзе чытаў, што Пятро Глебка, рыхтуючы да друку першы збор твораў Коласа, шчыра здзіўляўся, як многа той напісаў. Аднак не меншае здзіўленне выклікае, як многа і актыўна займаўся ён пры гэтым featuring рознабаковай грамадскай дзейнасцю. Скажыце, калі ласка, да гэтага яго вымушалі абставіны ці гэта было шчырае ўласнае жаданне?***

— І тое, і другое... У адным з пісьмаў бацька згаджаўся, што працаваў ён сапраўды многа і што заўсёды адгукаўся на кожную больш-менш значную падзею ў грамадскім жыцці і ў асабістым. Былі, канешне ж, сярод гэтых «водгукаў» і дзяжурныя, абавязковыя, якія разам з тым патрабавалі нямала часу. Але часцей за ўсё Колас браўся за пяро альбо стукаўся ў высокія кабінеты, каб дабіцца вырашэння якой-небудзь пільнай і важнай праблемы, якая яго хвалявала.

Прыходзілася прымаць удзел у пленумах і з'ездах кампартыі Беларусі. А іншы раз і востра выступаць. На XXII з'ездзе КПБ Колас узнімае пытанне аб ачыстцы палёў ад камення. Спасылаючыся на матэрыялы акадэмічнага інстытута геалогіі, ён пераканаўча паказвае, што зямля ў шэрагу раёнаў недапушчальна засмечана мноствам валуноў і камення і што гэта надзвычай негатыўна ўплывае на стан земляробства. А самае абуральнае, зазначае паэт, што для будаўнічых патрэб каменне завозяць з Украіны — тысячы кубаметраў.

І само сабой зразумела: сэрца Коласа поўнілася пастаянным клопатам аб развіцці роднай літаратуры. Выступаючы восенню 1954 года на трэцім з'ездзе пісьменнікаў Беларусі, ён з вялікай заклапочанасцю гаворыць аб тым, што ў нашай літаратуры няма твораў, у якіх была б адлюстравана веліч падзей апошніх гадоў. І гэта, на яго думку, кепска. Паэт павінен мець спагадлівае сэрца, каб адгукацца на ўсе праявы і падзеі ў жыцці, якія хвалююць людзей.

Клопатам пра літаратуру, пра роднае слова Колас жыў да апошняга. Пра гэта яскрава сведчыць ягонае пісьмо аб стане беларускай мовы, якое ён спрабаваў перадаць у апошні дзень свайго жыцця ў ЦК КПБ. Гэты ліст ён хацеў перадаць непасрэдна першаму сакратару — К.Т. Мазураву. Але той быў у ад'ездзе. Не ўдалося трапіць і да другога сакратара Ц.С. Гарбунова. Толькі праз некалькі дзён, ужо пасля пахавання бацькі, пазванілі Данілу, майму старэйшаму брату, і папрасілі даслаць ліст у ЦК. Даніла зняў копію і занёс ліст непасрэдна Гарбунову. У ім занатаваны галоўны клопат усяго жыцця паэта — клопат аб роднай мове, аб пашырэнні сферы яе ўжывання. Гэта — апошняе слова народнага паэта, якое можна разглядаць як запавет. Яно, на вялікі жаль, у многім і цяпер застаецца актуальным, таму я, рыхтуючы свае ўспаміны, палічыў неабходным прывесці ўвесь тэкст пісьма.

***— Не магу не запытацца у Вас вось пра што. Купала і Колас... Два народныя песняры, два нацыянальныя геніі. І, напэўна ж, паміж імі ішло своеасаблівае творчае спаборніцтва. Напэўна, яны досыць раўніва сачылі за творчасцю адзін аднаго. Ці не перашкаджала гэта іхнім узаемаадносінам?***

— Наколькі я магу меркаваць з асабістых уражанняў, не перашкаджала. Лічу, што ў Коласа і Купалы адносіны былі не проста таварыскія, а самыя што ні ёсць сяброўскія. Хаця не скажу, што ў гэтых адносінах было ўсё проста. Трэба ўлічваць натуру аднаго і другога. Колас быў абсалютна бясхітрасны і надзвычай чэсны чалавек. І таму ніякіх падвохаў нікому не мог зрабіць. Для яго Іван Дамінікавіч быў дарагі сябра, паплечнік. Купала ж быў трохі іншым чалавекам. Ён меў шырэйшую адукацыю. Вылучаўся сваёй шляхетнасцю, падкрэсленай інтэлігентнасцю.

Натуральна, што паміж дзвюма такімі рознымі натурамі здараліся і непаразуменні. На шчасце, яны ніколі не мелі прынцыповага характару.

Першая сустрэча Коласа і Купалы адбылася ўлетку 1912 года, у Смольні. Купала прыехаў цягніком і з чыгуначнай станцыі ў Смольню прыйшоў пехам. Бацька быў вельмі рады дарагому госцю. Двум, ужо вядомым паэтам, было пра што пагаварыць.

Наступным разам яны ўбачыліся няскора. Прычынай таму былі падзеі Першай сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, вымушанае знаходжанне Коласа на Куршчыне. І толькі пасля пераезду нашай сям'і ў 1921 годзе ў Мінск даўнія сябры зноў сталі сустракацца. Добра памятаю, што ўвесну 1931 года, калі паводка затапіла многія дамы ў пойме Свіслачы, тры тыдні Купала з жонкаю жылі ў нашай хаце. У сваю чаргу, летам 1941 года, калі мы ўцякалі з палаючага Мінска, Янка Купала прыслаў на станцыю Орша свой аўтамабіль і прывёз нас на сваю дачу ў Ляўках, дзе мы прагасцявалі пару дзён.

Добра памятаю, як яшчэ да вайны мы летавалі на Пухавіччыне і да нас, у Падбярэжжа, спякотным жнівеньскім днём завітаў Купала з жонкаю — цёцяй Уладзяй. Жанкі адразу ж пайшлі на купальню, а бацька і дзядзька Янка прыселі за столік пад грушаю-сапяжанкаю і за няспешнай гамонкаю асушылі бутэльку каньяку, якую прывёз госць. Пад вечар яны пайшлі на рэчку, паспытаць рыбацкага шчасця. Бацьку шанцавала: ён раз за разам выцягваў то здаровага, з кілаграм вагою язя, то ладнага галаўня, то плотку. А ў Купалы рыба не бралася, і яго азарт хутка выдыхся, ён пайшоў пад дубок, адпачыць. Мяне тут жа адправілі дахаты з наказам, каб да іх прыходу рыбу падсмажылі. Выдатная атрымалася вячэра!

Купала прыязджаў да нас і наступным летам, калі мы адпачывалі ў Вусці. А вось ці прыязджаў у Беразянку, не памятаю.

Апошні раз бацька сустракаўся з Купалам у Казані. Ёсць і здымак з сесіі Акадэміі навук, дзе яны сядзяць побач. А летам сорак другога прыйшла жудасная вестка — Купалы не стала. Бацька вельмі балюча перажываў страту свайго паплечніка, некалькі дзён хадзіў учарнелы.

# НЕ АДСТАВАЦЬ АД ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ


У майстэрні скульптара Івана МІСКО.

***— Міхась Канстанцінавіч, прыйшла чарга расказаць крыху і пра сябе. Тым больш што да апошняга часу мы ведалі і чулі пра Вас вельмі мала. Здаецца, упершыню загаварылі пра Вас, калі выйшла анталогія беларускай эпіграмы, дзе было змешчана і некалькі Вашых твораў. Чаму да гэтага Вы былі як бы ў ценю? На ўсіх літаратурных імпрэзах прысутнічаў Даніла, па тэлебачанні выступаў Даніла, са школьнікамі і студэнтамі сустракаўся Даніла...***

— Даніла быў дырэктарам музея. Старэйшы сын Якуба Коласа, ён, канешне ж, болей і лепей ведаў пра бацьку, і каму, як не яму, было расказваць пра гэта. А я займаўся сваёй справай і не лез у справы брата.

***— Здольным быў і Ваш сярэдні брат — Юрка, якому Вы прысвяцілі вельмі цёплую, прачулую аповесць «За вас зямлі я пакланюся...». Мне падалося, калі чытаў гэтую аповесць, што ў Вас з Юркам былі больш блізкія адносіны...***

— Не, напачатку і ён мяне, малога падшыванца, трымаў на адлегласці. У яго была свая кампанія з равеснікаў, а то і старэйшых хлопцаў. Мне, канешне ж, вельмі карцела пайсці разам з імі і ў лес, і на рэчку, але яны мяне з сабой не бралі. У іх былі ўжо свае сакрэты, свае таямніцы.

З Юркам мы сышліся ў апошнія гады. Я памагаў яму збірацца на паляванне, на рыбалку. А паляўнічы і рыбалоў ён быў заўзяты.

Юрку любілі ўсе — і свае, і чужыя. Любіў Юрку і Купала, калі прыходзіў да бацькі, абавязкова прыносіў нам якія-небудзь падарункі — звычайна, кулёчак цукерак альбо пячэння. А аднойчы прынёс шыкоўны альбом з малюнкамі самых розных жывёл.

Характар у Юркі быў лёгкі, вясёлы, у нейкай ступені нават бесшабашны. Разам з тым пры ўсёй сваёй бесшабашнасці, Юрка быў хлопцам сур'ёзным, самастойным, адказным. Гэтаму, мабыць, садзейнічала вось што. У маленстве ён рос шчупленькім, худзенькім. Яму часта даставалася ад старэйшых. Маці, калі ён прыбягаў паскардзіцца, казала яму: а ты не лезь у бойку. Навука гэта пайшла на карысць. Пазней я не аднойчы пераконваўся, як Юрка ў любой кампаніі з лёгкасцю заваёўваў бясспрэчнае лідарства.

Летам сорак першага брат з воінскай часці, дзе ён служыў, прыехаў у Мінск на стралковыя спаборніцтвы. Юрка вярнуўся са спаборніцтваў заўчасна — пачалася вайна. Яму трэба было з'явіцца ў камендатуру 24-га к дзвюм гадзінам.

У мяне і цяпер перад вачыма падзеі таго дня. Раніцай быў налёт нямецкіх самалётаў. У горадзе панавала трывожная мітусня. Перад адыходам Юркі ў ваенкамат мы прыселі з ім у двары, ля паветкі. Брат быў задуменны-задуменны. Сказаў толькі на развітанне: «Міхась, захавай мае стрэльбы. Скончыцца вайна, будзем разам хадзіць на паляванне». Стрэльбы я захаваў, а брат не вярнуўся.

Апошняе пісьмо ад Юркі было датавана 30 верасня і прыйшло недзе з-пад Смаленска, напярэдадні генеральнага наступлення немцаў на Маскву. І болей — ні вестачкі. Не сумняваюся, што смерць сваю ён сустрэў мужна, па-геройску. Але дзе знайшоў ён апошні прытулак, не ведаем да гэтага часу. Як пісаў бацька ў «Рыбаковай хаце»: «Мне боль пякучы сэрца гложа, і сына ўспомню я свайго. А дзе магіланька яго, мне адказаць ніхто не можа...»

***— А як склаўся Ваш далейшы лёс — пра гэта цікава было б пачуць. Раскажыце, калі ласка.***

— Вы ведаеце, я меркаваў, што буду біёлагам. Бацька нават ужо пасля заканчэння інстытута казаў мне: «Кінь свае металы, ідзі давучыся на агранома, ты ж любіш прыроду».

Што праўда то праўда, прыроду я любіў і люблю. Мусіць, гэта перадалося ад бацькі, ад тых нашых сумесных вандровак па лесе, па берагах Балачанкі і Свіслачы. Маё прыроднае захапленне яшчэ больш узмацнілася, калі да нас у Вусце стаў прыязджаць Юркаў знаёмы, супрацоўнік універсітэта Анастасій Васільевіч Вязовіч. Як ён ведаў прыроду! Як з ім было цікава! Ён знаходзіў сляды, на якія я ніколі не звярнуў бы ўвагі. А ён іх чытаў, як займальную кнігу. Згубленае птушынае пяро, выкапаная на ўзлеску ямка, прымятая пад кустом трава — усё гэта было зачэпкаю для цікавейшага аповеду. Мне здавалася, што цікавейшай прафесіі, чым прыродазнаўца, няма.

І можа так бы яно і было, я паступіў бы на біяфак і стаў бы біёлагам. Але ўсе мае планы перакруціла вайна. Сям'я наша апынулася ў Ташкенце. Там я скончыў дзесяцігодку. Скончыў, дарэчы, на выдатна. Нават па ўзбекскай мове ў мяне была пяцёрка. Так што калі нехта ў нас пачынае гаварыць, што яму беларуская мова даецца цяжка, я і слухаць не хачу.

**На XXII з'ездзе КПБ Колас узнімае пытанне аб ачыстцы палёў ад камення. Спасылаючыся на матэрыялы акадэмічнага інстытута геалогіі, ён пераканаўча паказвае, што зямля ў шэрагу раёнаў недапушчальна засмечана мноствам валуноў і камення і што гэта надзвычай негатыўна ўплывае на стан земляробства. А самае абуральнае, зазначае паэт, што для будаўнічых патрэб каменне завозяць з Украіны — тысячы кубаметраў.**

Ну, вось. Атэстат атрыманы, а што далей? Данік стаў мяне падбухторваць: ідзі на машынабудаўнічы факультэт, за маторамі, маўляў, будучыня. Бацькі асабліва не пярэчылі. Тым больш што Варонежскі авіяцыйны інстытут у час эвакуацыі знаходзіўся якраз у Ташкенце. Так я стаў студэнтам гэтай навучальнай установы. Пасля перавёўся ў Маскоўскі авіяцыйны інстытут на аналагічны факультэт. А дыплом па спецыяльнасці «тэхналогія машынабудавання» абараняў ужо ў Мінску, у Беларускім політэхнічным інстытуце. І з 1949 года маё жыццё цесна звязана з Фізіка-тэхнічным інстытутам Нацыянальнай акадэміі навук. Быў малодшым навуковым супрацоўнікам, галоўным інжынерам лабараторыі, загадчыкам лабараторыі, галоўным навуковым супрацоўнікам. Тут жа абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі.

***— Міхась Канстанцінавіч, дык хто ж Вы па сутнасці: прыроджаны тэхнар ці прыроджаны лірык?***

— Бацькавых здольнасцяў да паэзіі я не маю. А што датычыцца схільнасці да тэхнікі, то гэта ўжо набытае. Між іншым, лірыка ніколькі не перашкаджае тэхнару. Наадварот, дапамагае. Добрая паэзія, класічная музыка, наогул мастацтва абуджаюць у чалавеку фантазію, фарміруюць пачуццё гармоніі, прыгажосці. І трэба, каб такое далучэнне адбывалася як мага раней, з самага дзяцінства. Вось чаму кожны раз, калі выступаю перад школьнікамі, я гавару ім: не шкадуйце часу на літаратуру, на мастацтва. Хоць раз у год, але пабывайце ў мастацкай галерэі, у музеі. Хадзіце на спектаклі, у кіно... Яны ж зараз нават кніжак не чытаюць. Я ўжо не кажу пра музыку. Што яны слухаюць? Бяздарную, прымітыўную папсу. А што глядзяць? Тупыя, крывавыя баевікі альбо розную парнаграфію. Жах! Гэта ж страшнейшы біч, які занесены над нашай культурай.

***— Ведаю, што ў Вас ёсць яшчэ некалькі даўніх захапленняў — паляванне, рыбная лоўля, фатаграфія, музыка.***

— Ну, гэта ўжо сапраўды даўняе. Паляўнічы інстынкт у мяне прачнуўся вельмі рана, недзе гадоў у шэсць. Добра помню свой першы трафей, калі з рагаткі падбіў вераб'я. Не ведаю нават, чаго тады было больш — радасці ці шкадавання. Але паляўнічы азарт захапіў мяне цалкам. Бацька, аднак, не падзяляў гэтага майго захаплення. А вось вудзіць рыбу ахвотна хадзіў — і сам, і разам са мною. Цяпер на гэты занятак мне ўжо не хапае часу.

Шмат займаўся фатаграфіяй. У свой час я асвоіў амаль усе тыпы фотаапаратаў — айчынныя «ФЭД», «Кіеў», «Зеніт», нямецкія «Цэйс-Ікан», «Пентакон». У мяне такі багаты фотаархіў, што, каб пераглядзець усе плёнкі, не хопіць і некалькіх дзён. Самае каштоўнае — гэта, канешне, здымкі Коласа. З дублямі іх набярэцца звыш сотні. Ёсць унікальныя кадры, скажам, такія, дзе бацька стаіць пасярод Балачанкі, па пояс у вадзе. Вельмі дарагія мне здымкі маіх братоў Данілы і Юркі, дзядзькі Ігнася. А колькі цікавых негатываў з вядомымі нашымі пісьменнікамі, дзеячамі культуры. Трэба было б дабрацца да гэтых негатываў і нарэшце надрукаваць з іх карткі — гэта ж частка нашай культуры, нашай гісторыі.

Даўняе і пастаяннае маё захапленне — музыка. Мне падабаюцца народныя песні. Люблю рамансы — Булахава, Гурылёва, Варламава і іншых кампазітараў. Раней часта хадзіў у філармонію слухаць класічную музыку. Цяпер у нас дома (гэтым займаецца сын Костусь) сотні тры касет з запісамі лепшых сусветных опер, сімфоній, канцэртаў.

Гадоў трыццаць таму наша філармонія арганізоўвала цыклы канцэртаў з твораў сусветна вядомых кампазітараў. Многія людзі куплялі абанементы і хадзілі слухаць сапраўдную музыку. Хадзіў на іх шэраг супрацоўнікаў і нашага інстытута. Якую асалоду атрымоўвалі яны!

Зразумела, для гэтага патрэбны пэўная падрыхтоўка, неабходная адукацыя. Прычым набываць яе трэба, пачынаючы са школы. Зараз гэта вельмі проста. Адпаведная тэхніка ёсць, а касет з запісамі колькі хочаш. Было б, як кажуць, жаданне.

***— Вы шчаслівы чалавек?***

— Лічу, так. Шчасце — паняцце шматграннае. Па-першае, самае вялікае шчасце — гэта само жыццё, існаванне. Па-другое, шчасце — калі ты здаровы і ў цябе нічога не баліць.

Шчасце — калі ў сям'і згода і ўзаемаразуменне.

Шчасце — калі ты маеш шчырых сяброў і карыстаешся іх павагай.

Шчасце — калі табе падабаюцца твая работа і яе вынікі.

Шчасце — калі здзяйсняюцца твае мары і жаданні.

**Гутарку вёў Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

## Усё пра Еву

### ■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»



# ІНДЫЧКУ ШКАДА...

**З мужчынамі спрачацца бессэнсоўна. Гэта аксіёма жыцця. У сэнсе, куды нам да іх!.. Але са спадаром Фрыдрыхам, нават нягледзячы на яго анёльскае прозвішча — Энгельс, — я ўсё ж дазваляю сабе час ад часу не пагаджацца. Прынамсі, чалавека стварыла не праца. Чалавека стварыла ежа. Калі дакладней, то нават не ежа, а спосаб яе гатавання.**

Калі чалавека (як, зноў жа, мужчына сцвярджаў) ствараюць акалічнасці, то акалічнасці паху і смаку тут далёка не апошнія. Але вось якая адметнасць адкрылася для мяне за вячэрняй гарбатай з чабару: мы ёсць не столькі тое, што мы спажываем, колькі тое, як апісваем працэс гатавання.

На маю асабістую думку, кулінарыя — мастацтва не менш цудадзейнае, жыватворнае і высокае, чым астатнія. Не нейкая ўтылітаршчына, а самы сапраўдны шлях спасціжэння ісціны і яе вытанчанае адлюстраванне. Болей за тое, абазнанасць у гэтым мастацтве аўтаматычна пазбаўляе чалавека неабходнасці дэманстраваць свой інтэлект як-небудзь яшчэ. Валодаючы майстэрствам гатавання, валодаеш нечым быццам бы няўлоўным. Але ж яно будзе абавязкова ўлоўлена і абавязкова адаб'ецца на ўяўнай шыльдачцы: "Чалавек разумны".

Атрымліваючы асалоду ад сузірання працэсаў кулінарнай творчасці, мужчынскай і жаночай (дзякуючы сапраўднаму буму кулінарных тэлеперадач), прыйшла я да адной сумнай высновы: мужчыны вельмі псуюць свой імідж лепшых кулінараў, калі выстаўляюць інтэлект напаказ (прынамсі, у кулінарных перадачах)... Затое цяпер можна праз гэтыя кулінарныя перадачы даведацца пра мужчыну, які гатуе, нашмат больш, чым калі б ён не гатаваў, а займаўся сваёй штодзённшчынай: спяваў, танцаваў, пісаў, гаварыў, кіраваў... Інакш кажучы, кулінарыя — гэта маркер, дэтэктар «розуму наадварот».

Калі, напрыклад, удзельнік рэйтынгавага інтэлектуальнага шоу, трапіўшы са студыі-рынга ў студыю-кухню, пачынае распавядаць пра дэнатурацыю бялку і клейстэрызацыю крухмалу, калі румяную скурку запечанай індычкі называе вынікам дэгідратацыі верхніх слаёў мускульнай тканкі і карамелізацыі вуглевадародаў, а непаўторны водар, які ідзе ад разрэзанага пірага, тлумачыць канцэнтрацыйнай дыфузіяй, то... Становіцца шкада прадуктаў. Мне шкада іх так, быццам індычка была ўзгадавана на маім прысядзібным участку, а варэнне для пірага варыла мая любая бабуля. Вы прыглядзьцеся да такіх кулінараў уважліва: гатуюць яны, склаўшы рукі за спіной, выключна намаганнямі калег — вядучых кулінарных праграм...

Асабіста мне — не смачна ■

### ■ Паміж намі

# КЛАСІКА «ТРОХКУТНІКА»

**Праглядаючы днямі «гарачы форум» на адным з жаночых сайтаў, «зачапілася» за абмеркаванне старой, як свет, але па-ранейшаму актуальнай праблемы класічнага «трохкутніка»: муж — жонка — палюбоўніца. Асабліва ўразіў наступны пасаж (чытай — крык душы):**

**«Хачу, каб хоць хто-небудзь ведаў: я — шчаслівая жанчына, таму што каханая. Сустракаемся мы не вельмі часта. У Сашы — свая сям'я, дзеці. Ён — чалавек абавязку і ніколі іх не кіне. Ужо мінуў год, як мы пазнаёміліся, а ён ні разу не застаўся ў мяне начаваць. Затое там, дома, ён увесь час думае пра мяне. І гэта — самае галоўнае. Мы дорым адзін аднаму шчасце сапраўднага кахання. Не памятаю выпадку, каб Саша нагрубіў ці разззлаваўся на мяне... Заўсёды — з кветкамі, заўсёды ў адпрасаванай кашулі... Так, я — палюбоўніца. А вы — сумленныя жонкі, клапатлівыя маці... Ну дык што? Затое мне не трэба выслухоўваць бясконцыя папрокі, да позняй ночы завіхацца на кухні, а ноччу бачыць павернутую да мяне спіну... Вы прасуеце мужу штаны, у якіх ён потым ідзе на спатканне. Безумоўна ж, не з вамі, а са мной або з такой, як я. Дык каму з нас лепш?..»**

Ведаю я адну ўтульную кватэрку... Усё ў ёй, пачынаючы ад кухонных палічак і завяршаючы люстрай у гасцінай, зроблена, прыбіта, прыкручана клапатлівымі мужчынскімі рукамі. Амаль кожная дарагая рэч за шклом — падарунак. Ружы ў вазе — таксама... У ванным пакоі вісіць мужчынскі махровы халат. У пакоях ледзь улоўна пахне цыгарэтамі і мужчынскім парфумам... Але мужчына тут не жыве — толькі бывае.

У адрозненне ад аўтара працытаванага вышэй прызнання гаспадыня кватэры шчаслівай сябе не лічыць. «Ружовы этап» у адносінах з каханым даўно мінуў, але ён усё роўна прыходзіць сюды, праўда, не так часта, як некалі. Пасля яго на кухонным стале застаецца бутэлька з фірменнай наклейкай і той самы пах французскай парфумы. Ну і ружы, канешне...

Сам мужчына спяшаецца да сваёй сям'і. А дзясятай гадзіне вечара ён павінен пакласці спаць сына і пажадаць яму добрай ночы. А раніцай адвесці яго ў дзіцячы садок. А яшчэ — праверыць урокі ў дачкі, таму што ў яе — складаны перыяд, пераходны ўзрост і ўсё такое... Дзяўчынка пярэчыць настаўнікам, прапускае ўрокі, таму патрэбны пастаянны кантроль... Часам ён тэлефануе дадому прама адсюль, з Вольгінай кватэры. Цікавіцца ў жонкі, як прайшоў дзень, як паводзяць сябе дзеці... Папярэджвае, што крыху затрымаецца «на працы». Абяцае ў нядзелю звазіць сына ў заапарк. Нагадвае пра нейкія хатнія дробязі. Удакладняе, што купіць у краме па дарозе дадому... Скончыўшы размову, паварочвае да Вольгі стомлены прыгожы твар: «Прабач, малыш, — ты ж разумееш...» І вінавата ўсміхаецца.

За гэтую ўсмешку яна гатова дараваць яму ўсё. Нават тое, што трэці год іх адносіны «топчуцца на месцы», а пасля кожнага кроку наперад атрымліваецца два назад.

Самае цікавае, што жонка Максіма ўсё ведае. Ведае — і робіць выгляд, што нічога не адбываецца. Ёй так спакайней... Безумоўна, Вольга здагадваецца, якімі словамі называе яе «афіцыйная палова». Але ёй, мякка кажучы, гэта да лямпачкі. Жонку церпяць — яе кахаюць... Увогуле, Вольга ўпэўнена: калі б не яго дзеці, была б у іх сям'я. Дарослыя людзі, абодвум пад сорак. Але склалася так, што трэба ад усіх хавацца: ад яго сяброў, ад яе бацькоў, ад супрацоўнікаў, суседзяў, знаёмых... «Ну чаму мы такія нешчаслівыя? — каторы раз задае Вольга рытарычнае пытанне. — Чаму пячатка ў пашпарце мацнейшая за сапраўднае каханне?»



А ў тым, што яно сапраўднае, Вольга не сумняваецца. Кожнага, хто так ці інакш спрабуе яе разупэўніць, успрымае «ў штыкі». І ў якасці доказаў прад'яўляе бутэлькі з замежнымі напоямі, прыгожыя бляшаначкі з цукеркамі і іншыя сувеніры з розных краін свету, ну, і канешне, жывыя кветкі ў вазе ў любую пару года... Ці ж гэта ні аб чым не гаворыць?

Каханне, як вядома, гэта адносіны дваіх. «Другі» бок, на жаль, у рэальным жыцці бачыць не давялося. Ён увесь час нібыта выслізгвае, «знікае ў тумане», расплываецца і прымае неакрэсленыя абрысы. З моцнага і прыгожага (мяркуючы па здымках, выкладзеных у інтэрнэце) мужчыны ператвараецца ў істоту, якая прывыкла да сваёй утульнай кватэры і пэўнага ладу жыцця... У рэшце рэшт, да жонкі, што мые бялізну і варыць смачныя баршчы. Жонка шкадуе, Вольга чакае (ці наадварот)... Чым дрэннае жыццё? Хоць ён, канешне, любіць удаваць з сябе пакутніка. Яшчэ б! Разрывайся на часткі, напружвайся, каб не пераблытаць імёны і дні нараджэнняў, хавайся, выварочвайся, ілжы і не чырваней... Каханне і абавязак, абавязак і каханне. Туды — сюды, сюды — туды... А насамрэч дзе? Ні там, ні там. Хіба што да кахання мы пачалі ставіцца больш спрошчана, больш прымітыўна... Абдурыў жонку і шэфа, збег з працы на спатканне на гадзіну-другую — ужо подзвіг. Прынёс з сабой не звычайную бутэльку шампанскага і каробачку цукерак, а нешта з заморскай назвай, ды яшчэ кветкі ў прыдачу — ужо ахвяра... Ну а калі ўсё разам сабраць, атрымліваецца... каханне?

З пачуццём абавязку таксама не ўсё зразумела. Каму і чым абавязаны мужчына? Абавязаны лгаць жонцы, прыходзячы дадому ад іншай жанчыны? Абавязаны выхоўваць дзяцей (якія, дарэчы, усё адчуваюць і разумеюць) у атмасферы пастаяннага недаверу і хлусні? Абавязаны гэтай самай хлуснёй правакаваць сваркі і скандалы ў сям'і?.. Каму патрэбны такі абавязак? І ці не прыдуманы ён жанатымі прадстаўнікамі моцнай паловы, каб неяк апраўдаць сваю нерашучасць у вачах так званых «каханых» жанчын? Усялякая спроба змяніць рэальнае жыццё — развесціся, кінуць палюбоўніцу — патрабуе пэўных намаганняў. Дык навошта складана, калі можна прасцей? Вось і прыходзіць на дапамогу «пачуццё абавязку»... Дарэчы, Вольга і сама з радасцю ўспрымае гэта тлумачэнне. У рэальным становішчы спраў яна не прызнаецца нават самой сабе. А становішча такое, што і абавязак, і каханне знаходзіцца пад вялікім сумненнем.

...Вось і незнаёмка з жаночага форума — пра тое ж самае. Пра вялікае і светлае, з кветкамі і чыстай кашуляй. (Чым не дакладныя прыкметы?) Толькі пры чым тут кашуля, калі на ўчынак мужчына так і не асмельваецца? «Я — шчаслівая!» — сцвярджае яна, але гэта гучыць хутчэй як выклік. А бравада — яна звычайна ад разгубленасці...

Чалавек вызначаецца ў гэтым свеце, толькі здзейсніўшы ўчынак. У сітуацыях, пра якія ідзе гаворка, на ўчынак аказваецца не здольным ніхто. Усе могуць толькі рэфлексаваць, калупацца ў сябе, гуляць у свае пакуты, але пакуты гэтыя не вынікаюць з сапраўдных пачуццяў, а таму падобны на мыльныя бурбалкі... І галоўнае — ніхто нічога не хоча змяняць. Нават жонка, якую ў дадзенай сітуацыі прынята лічыць ахвярай. У яе свая тактыка. Муж начуе дома, грошы прыносіць, з дзецьмі займаецца... Каб сапраўды хацеў збегчы, даўно ўжо збег бы. Не збягае — значыць, нічога «тыя адносіны» не вартыя. Пацерпім...

Так і жывуць, кожны са сваімі ілюзіямі. Адны — супакойваючы імі сябе, другія — натхняючы...

А побач — толькі руку працягні — праходзіць сапраўднае жыццё. На жаль, незваротна...

**Ала БЫВАЛАВА** ■

### ■ Гісторыі з канверта

# КАБ УРАЗІЦЬ... ІНШУЮ

У кабінеце нас двое — я і мая маладая калега Анжэла. Звярнуў сёння яе ўвагу на тое, што наша кіраўніца — Аліна Аляксандраўна — трымае сябе заўжды ў цудоўнай форме; вытанчаная інтэлігентнасць і прыродная прыгажосць — рэдкае спалучэнне для кіраўніка.

— Ну, гэта больш чым відавочна, — згаджаецца Анжэла. — Наша кіраўніца ў сваёй знешнасці прадугледжвае кожную дробязь, яна, як кажуць, на вышыні... А ці заўважыў ты, што у яе нарошчаныя пазногці?

— Што?.. Якія пазногці? Прычым тут пазногці? Мне да ліхтара, якія яны... Хоць сабе ўвогуле і без іх.

Мой мужчынскі інтарэс-цікавасць да Аліны Аляксандраўны — гэта яе прыцягальная ўсмешка, хвалюючы погляд, мілыя гуллівыя ямачкі на шчочках, яе прыгожая паходка і, скажам прама, сексуальная фігура... А тут — нейкія пазногці?

— Ды ў нашым райцэнтры адкрылася некалькі кропак, дзе займаюцца толькі пазногцямі! Няўжо ты думаеш, што жанчыны трацілі б грошы — і не маленькія! — на тое, што не падабаецца вам? Каго ж мы яшчэ хочам уразіць, як не мужчын?

Я не думаю, што жанчыны звар'яцелі і выкідваюць грошы на вецер, проста заўважыў, што яны робяць многае для таго, каб уразіць... іншых жанчын. Нарошчаныя пазногці нашай Аліны Аляксандраўны — гэта для Ірыны Сяргееўны, Наталлі Ігараўны, Святланы Іванаўны, прадстаўніц розных структур, дзе яна бывае. Я скажу болей: прыкладна палова ўсіх жаночых намаганняў з індустрыі прыгажосці накіраваны для стварэння эфекту ў вачах сабе падобных — калег, канкурэнтак, суседак, сяброўак, знаёмых і незнаёмых... Вы гэтага проста не разумееце, думаеце, што імкнецеся ўразіць мужчыну. Але ўсё гэта «ляціць міма». А мы... мы вас любім за іншае. Зусім за іншае.

Міжволі ўзгадаў выпадак, што адбыўся падчас адной з выпадковых пасядзелак нашага калектыву ў рэстаране некалькі гадоў таму. Адну нашу супрацоўніцу — Вольгу — «прыкмеціў» падпалкоўнік з ліку адпачываючых, раз за разам запрашаў яе на танец. А яна, усхваляваная, дакарала сябе, што выглядае «па-дамашняму», што не падрыхтавалася належным чынам да мерапрыемства — ні табе «поўнага» макіяжу, ні манікюру. Маўляў, і сама адчувала б сябе ўпэўнена, і падпалкоўніка «зваліла б напавал». Можа, гэта так, але калі б яна сядзела, як царыца на троне, той падпалкоўнік на яе і не паглядзеў бы...

**Аляксандр Г** ■

■ Вельмі асабістае

# ЦЯГНІК, ЯКІ НЕ СЫДЗЕ З РЭЕК



**Сёння 23-я гадавіна бабулінага сыходу... Дзесьці каля пяці гадзін раніцы яе сэрца перастала змагацца з гэтым жыццём. Стамілася. Спачатку — бунтавала, думала, што зможа гэтае жыццё змяніць... А потым змірылася... Занадта шмат бітваў. Цяжка, калі адзін цягне ўсіх. У сям'і заўсёды ёсць адзін, які цягне па жыцці астатніх. А астатнія проста прыладжваюцца. Яны бясклапотныя і эгаістычныя. Бо ведаюць, што ёсць ЁН — «чалавек-паравоз», які ўсё твае памылкі прыме на сябе, ахоўваючы цябе. І таму ты можаш сабе дазволіць, а ЁН — не. Таму што ЁН — за вас усіх у адказе. Як у Экзюперы.**

Я памятаю, у той вечар я чамусьці танчыла перад люстэркам. А раніцай мне патэлефанавалі. І невядомая медсястра на тым канцы проваду сказала: «Ваша МАМА сёння ноччу памерла...» На тым канцы проваду нават не ведалі, як яны патрапілі ў цэль, калі памыліліся ў вызначэнні сваяцтва. Але я не стала папраўляць незнаёмку, таму што бабуля сапраўды была для мяне мамай. У самым вялікім сэнсе гэтага слова.

«Чалавека-паравоза» не стала. Праз тыдзень родны брат прызначыў галоўнай жанчынай роду мяне, сказаўшы: «Бабулі няма, цяпер ты будзеш нашай мамай...» І я ўстала на гэтыя рэйкі. А ўсе астатнія прычапіліся за мной з вагонамі сваіх праблем...

У думках я часта «адкручваю» гадзіннік назад... Яшчэ толькі 15 хвілін першай. Яшчэ ёсць час. І бабуля яшчэ сядзіць на сваім бальнічным ложку і думае пра мяне. І чарговы раз «спальвае» сваё сэрца.

А ў мяне ўсё дрэнна. Поўны разрыў з «першым — былым». Я ўжо не дыхаю некалькі месяцаў. За мяне дыхае бабуля, і ёй вельмі цяжка даецца кожны ўздых, і нясцерпным болем сціскае яе сэрца...

Бабуля не спіць ужо якую ноч. Яна ведае, што заснуць нельга, таму што гэта будзе развітальны сон. Але я пра гэта яшчэ не здагадваюся. У мяне ж усё дрэнна, і я займаюся «самакапаннем», увесь час думаючы пра тое, што робіць «ён» — той, з якім у мяне «разрыў». І зусім забываю, што за мяне дыхае бабуля... Забываю, як забываюць пра бацькоў дзеці на дзіцячай пляцоўцы, калі іх доўга не клічуць дадому. А так часам хочацца, каб цябе нехта паклікаў.

...Што змянілася з таго часу, як я прыняла тваю эстафету, бабуля? Нічога. Усё гэтак жа сціскае сэрца...

Сёння вечарам я глядзела на сваю пакрыўджаную дачку Альку, якая сядзела на канапе сярод раскіданай драбязы. Яна яшчэ не разумее дарослых гульняў. І не разумее, што мы, дарослыя, увесь час дзелім, калі вакол так шмат яркіх цацак? Усім жа хопіць!.. Дзве адзінокія жанчыны ў ціхай кватэры. Жанчына — маленькая і жанчына — вялікая аднолькава пражываюць сум. Няўжо, дачушка, я перадам табе «эстафету» адзіноты? Як не хочацца... Як я хачу, каб у тваім жыцці было шмат сонца, каб у ім быў надзейны, моцны мужчына. «Цягнік», які можа павезці хоць на край свету і не сыдзе з рэек.

Чаму шчасце такое хуткабежнае, а няшчасці цягнуцца доўгай чарадой? І галоўнае, што ніхто не ўратуе. Толькі ты сам. Калі набярэшся смеласці нырнуць глыбей у гэты вір, і каб потым цябе выпхнула на прастору свабоды, дзе будзе шмат паветра і сонца! Калі атрымаецца... І ўжо няма каму дапамагаць табе дыхаць. Цяпер твая чарга дыхаць за тых, каго ты прыручыла...

Як жа хочацца пакласці галаву на твае калені, бабуля! І зноў апынуцца ў нашым садзе, на той вуліцы, якой даўно ўжо няма на карце... Дзе топіцца печка і чуваць, як рыпае снег пад нагамі рэдкіх мінакоў. Дзе паміж шклянымі рамамі на ватных падушках ляжаць яркія ёлачныя цацкі, а вокны чакаюць — калі з іх прыбяруць гэтую дэкарацыю, памыюць, і яны адкрыюцца. І нехта абавязкова цябе пакліча... Але я не маю права плакаць. Я прыняла эстафету. Лёс прызначыў мяне галоўнай жанчынай.

**Ларыса КАРАСІНА**

■ Пад мікраскопам

# СЛАБЫ МОЦНЫ ПОЛ

## 10 мужчынскіх комплексаў, пра якія яны наўрад ці вам раскажуць

**Яны верныя і надзейныя. Яны клапатлівыя і далікатныя. Яны моцныя і ўпэўненыя ў сабе. І ніводны з іх ніколі не прызнаецца, што «нішто чалавечае яму не чужое». Гаворка пойдзе пра нашых мужчын, іх комплексы і спосабы іх пераадолення.**



### «Вечна другі»

Расшыфроўваецца ён вельмі проста. Вось вы заўважаеце, што падабаецеся мужчыну (дапусцім, ён глядзіць на вас, не адводзячы вачэй). Зразумела, вы ж шыкоўна выглядаеце! Але — вось нечаканасць! — на вашых вачах ён падыходзіць да іншай, больш сціплай асобы. Чаму?

Псіхолагі тлумачаць такія паводзіны тым, што большасць мужчын, убачыўшы прыгожую жанчыну, аўтаматычна адносяць яе да разраду «несвабодных». Бо не можа ж быць, каб такая жанчына — і адзінокая! Думаючы, што яго шанцы невялікія, амаль мізэрныя, ён, «рыбак і паляўнічы» па сваёй мужчынскай сутнасці, не жадае быць другім, вось і выбірае больш простую «рыбу». Пакольні, нават калі і даб'ецца прыхільнасці прыгажуні, яму ўвесь час трэба будзе «разграбаць» вакол яе натоўп зачараваных паклоннікаў. А не ўсякаму паляўнічаму гэта падабаецца.

Што рабіць нам, прыгожым і адзінокім? Усё вельмі проста: трэба навучыцца самім завязваць адносіны з прадстаўнікамі моцнага полу. Так-так, давайце адразу расставім усе кропкі над «і». Не трэба хаваць, што ён вас зацікавіў. Дайце яму шанц!

### «Падмануты»

Як распазнаць? Вы бавіце шмат часу разам, а ён ні разу нават не паспрабаваў вас абняць? Вы б з задавальненнем гулялі з ім да раніцы, трымаючыся за рукі, але ён не праяўляе ініцыятывы. Вы хочаце прытуліцца да яго, а ён адразу ж адхіляецца. І пастаянна згадвае пра сваіх былых сябровак, дакладней, пра тое, як яны яго кінулі, і разважае пра бесперспектыўнасць любых зносін.

У гэтым выпадку падыдзе тактыка чакання. Не спяшайцеся наладжваць адносіны. Ён жа баіцца, што як толькі вам даверыцца, вы абавязкова скарыстаецеся гэтым. І калі вы бераце ініцыятыву ў свае рукі, каб пачаць адносіны, то і разарваць іх, з. кн. кінуць яго, для вас не станецца цяжкім. Дайце яму зразумець, што чакаеце першых крокаў ад яго. Будзьце шчырай. Гэта менавіта тое, чаго ён ад вас не чакае.

### «Нерэалізаванасць»

Такому мужчыну нярэдка няма чаго расказаць пра сваю дзейнасць, ідэі, планы на будучыню. Ён адчувае, што не рэалізоўваецца ў гэтым жыцці.

Кожнаму з нас важна рэалізаваць свой патэнцыял, мужчыну ж асабліва важна стаць паспяховым. Яшчэ больш, калі побач з ім такая, як вы. Калі цяперашняе яго становішча (кар'ернае, фінансавае, творчае) не прыносіць яму задавальнення, ён будзе адчуваць сябе няшчасным.

Чым вы можаце дапамагчы яму? Кажуць, што ўсе нашы «дарослыя» захапленні бяруць пачатак з дзяцінства. Толькі пад цяжарам гадоў мы іх забываем. Распытайце, чым займаўся ваш абраннік раней, што прыносіла яму радасць? Магчыма, успомніўшы свае захапленні, ён рэалізуецца ў якой-небудзь творчай сферы, а магчыма, гэта падштурхне яго распачаць уласную справу.

### «Папік»

Калі ваш сябар нашмат старэйшы за вас, накавольныя не заўсёды разумеюць, якога роду адносіны вас звязваюць. Гэта хваравіта ўспрымаецца мужчынам, ён пачынае «адчуваць» свой узрост.

Што вы можаце зрабіць для яго? Толькі нястомна паўтараць, што ён самы лепшы на свеце і большага шчасця вам не трэба.

### «Няхватка грошай»

Вельмі папулярны комплекс у нашы дні. Міма рэстаранаў ён праходзіць з апушчанай галавой, ад размоў на грашовыя тэмы пастаянна ўвільвае, людзей з дастаткам вышэй за пражытковы мінімум называе «буржуямі»...

Вы павінны дапамагчы яму зразумець, што не ўсё ў жыцці купляецца за грошы. Напрыклад, ваша каханне — яно наогул бясцэннае. Не ўсім хочацца жыць на ўласных астравах і валодаць заводамі і пароходамі. Некаторыя аддаюць перавагу ціхім радасцям у выглядзе паходу з сям'ёй у бліжэйшы лес з турыстычным заплечнікам. А вось паспрабаваць дасягнуць некаторых фінансавых вышыняў яму цалкам пад сілу.

### «Неадпаведнасць»

Не такі папулярны ў наш час, як раней. Гэта калі ў вас, як кажуць, розныя статусы. Вы — з інтэлігентнай сям'і, а ён — з «рабоча-сялянскай». Або вы — паспяховая бізнесвумен, а ён — работнік па найме ў невялікай установе.

Тут правільна будзе адысці ад таго, што вас раз'ядноўвае. Знайсці агульныя інтарэсы, адно захапленне, часцей ужываць слова «мы». Калі вы станеце адным цэлым, то ваш мужчына ў адзін цудоўны дзень перастане думаць пра тое, наколькі вы не падыходзіце адно аднаму.

### «Хатні гаспадар» (ён жа «комплекс Геракла»)

А гэта ўжо з галіны старажытнагрэчаскай міфалогіі. Аднойчы паўбог Геракл, які здзейсніў мноства неверагодных подзвігаў, трапіў у рабства да царыцы амазонак, якая прымушала яго прыслужваць ёй, — выконваючы чыста жаночую працу (напрыклад, прасці).

Баязь стаць «хатнім гаспадаром» сёння пераследуе вялікую колькасць мужчын. Яны катэгарычна адмаўляюцца выконваць па доме хоць якуюнебудзь жаночую працу. Праўда, тое, што гэта — страх, ведаюць толькі псіхолагі. Большасць жа жанчын мяркуюць, што гэта — звычайная лянота. Хто мае рацыю?

### «Выдатнік»

У такіх людзей усё павінна быць выканана на «пяць з плюсам». Яны проста паталагічна не могуць быць горшымі за кагосьці. А гэта не заўсёды проста даецца. Каб не ведаць праблем у жыцці з такім мужчынам, трэба даць яму зразумець, што вы любіце яго такім, які ён ёсць, і што адной зоркі з неба вам цалкам дастаткова.

### «Непаўнацэннасць»

Ну, гэты комплекс знаёмы многім. Таму што мала хто з нас задаволены сабой на ўсе сто. Застаецца толькі вызначыць, наколькі моцна закамплексаваны ваш абраннік і што менавіта не дае спакою яму. Адзінае, што стапрацэнтна з'яўляецца прыкметай комплексу непаўнацэннасці, — гэта пачуццё рэўнасці.

Калі выпадак не хранічны, то галоўнае — не рабіць акцэнт на тым, што з'яўляецца прычынай яго няўпэўненасці ў сабе (невялікі рост, лысіна, піўны жывоцік), а часцей хваліць яго і гаварыць пра добрыя якасці (розум, надзейнасць, пачуццё гумару і г. д.). У самых запушчаных выпадках закамплексаваны мужчына пачынае кампенсаваць свае недахопы, зневажаючы тых, хто яго акружае. Калі вы адчулі, што ён адыгрываецца на вас, падумайце, ці вартыя адносіны працягу. Калі так, то для вырашэння праблемы лепш звярнуцца да прафесіяналаў.

### «Страчаны час» (крызіс сярэдняга ўзросту)

У многіх мужчын, якія да 35—40 гадоў (у кожнага гэта індывідуальна) не змаглі дабіцца таго становішча і ўзроўню паспяховасці, да якіх яны імкнуліся, пачынаецца так званы крызіс сярэдняга ўзросту.

Параўноўваючы сябе з багатымі і паспяховымі равеснікамі, нават вельмі маладыя людзі нярэдка пачынаюць камплексаваць. Што ўжо гаварыць пра тых, у каго за плячыма паўжыцця. Мужчына ацэньвае свае дасягненні, перамогі і пройгрышы. Для моцнай натуры гэты комплекс можа стаць добрым стымулам для руху наперад, але больш слабыя здаюцца без барацьбы. Гэта сапраўды складаны мужчынскі комплекс.

Як падтрымаць чалавека? Не ўсім мужчынам дапамагаюць лагічныя развагі, асабліва калі закранута іх самалюбства. У гэтым выпадку лепшай дапамогай можа стаць адданае і бескарыслівае каханне. Калі мужчына будзе бачыць, што яго прымаюць такім, які ён ёсць, ён можа перастаць так востра перажываць свае няўдачы, страпянецца, і яму будзе лягчэй дасягнуць поспеху. А яшчэ трэба часцей нагадваць пра тое, што чалавек паспяховы — гэта зусім не абавязкова чалавек багаты, а грошы яшчэ не з'яўляюцца гарантыяй шчасця.

**Вера ФЕМІНА**

# ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов. 25.02.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 6**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Бориски, участок № 7, кадастровый номер 6232880021000017 | 0,2500 га | Подъездные пути удовлетворительные | 30 107 700 | 6 021 500 | 5 193 800 |
| 2 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, д. 27 «А», кадастровый номер 623288001601000094 | 0,2125 га | Подъездные пути удовлетворительные | 37 736 700 | 7 547 300 | 13 569 600 |
| 2 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, д. 15 «А», кадастровый номер 623288001601000092 | 0,1369 га | Подъездные пути удовлетворительные | 24 311 300 | 4 862 300 | 13 569 600 |

*Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ № 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

**Аукцион состоится 25.02.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 6.**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 20.02.2016 г.** (последний день подачи заявления – **19.02.2016 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактные телефоны: **(8 01774) 57 4 35, 57 4 99.**

**Отдел принудительного исполнения Витебского района реализует, путем проведения торгов, имущество, принадлежащее ООО «Лесэкопром», а именно:**

**ЛОТ № 1.**

## «Автомобиль грузовой бортовой ГАЗ 5312»,

**год выпуска 1988, регистрационный номер AI 2281-2 стоимостью 8 556 000 рублей, данное имущество находится по адресу: Витебский район, д. Вороны, ул. Садовая, 19.**

**Торги по продаже данного имущества назначены на 04 февраля 2016 года в 10 часов утра по адресу: г. Витебск, ул. Комсомольская, 31, каб. 14.**

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:

1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.

2. *Внести залог в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района г.Витебска: филиал №200 АСБ «Беларусбанк», код банка 150801635, р/с 3642903002661, УНП 300002505, не позднее 03.02.2016 года.*

Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.

В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

Интересующую информацию можно получить в отделе принудительного исполнения Витебского района, г. Витебск, ул. Комсомольская, 31, каб. № 14, либо по тел.: 8 (0212) 23-64-15, 36-32-15.

# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки и аг. Барсуки Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | **23 февраля 2016 года в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000093 в деревне Напалки, участок № 1. **Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2. **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1485 га с кадастровым номером 624881701101000413 в агрогородке Барсуки. **Лот № 4** – земельный участок площадью 0,1146 га с кадастровым номером 624881701101000412 в агрогородке Барсуки |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7. | **Начальная цена продажи** | **Лот № 1** – 30 000 000 рублей **Лот № 2** – 30 000 000 рублей **Лот № 3** – 100 000 000 рублей **Лот № 4** – 100 000 000 рублей |
| 8. | **Условия проведения аукциона** | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | **Лот № 1, Лот № 2 (возможность электроснабжения). Лот 3, Лот № 4 (возможность электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения)** |
| 10. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»), код платежа 04901 |
| 11. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждый понедельник в 15.00 |
| 12. | **Окончательный срок приема заявлений** | **17 февраля 2016 года до 17.00** |
| 13. | **Контактные телефоны** | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

Утерянные бланки полисов формы 2 РП, 2РН серия КЕ №0080391, формы 2 РН КЕн 0035562, формы 2РП КЕп 0011050 **считать недействительными.**

УНП 100985903

# Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства торгово-гостиничного комплекса по ул. Калючинской в городе Гродно 25 февраля 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Калючинская | 0,2849 | 440100000002008546 | 2 238 773 900 | 220 000 000 | 40 110 836 | Строительство торгово-гостиничного комплекса 3-этажных зданий (торговые объекты, предприятие общественного питания, гостиница) |

** – Ограничения в охранных зонах линий электропередач, в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, в охранных зонах сетей и сооружений канализации, охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей.*

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

